Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

19 ЖНІЎНЯ 2021 г. ЧАЦВЕР № 158 (29527)

АЛЕНА АТРАШКЕВІЧ — ПРА СЯМ'Ю І КАР'ЕРУ

ЛЯЛЬКІ ЯК МАСТАЦТВА

ЦЫТАТА ДНЯ

Аляксандр ТУРЧЫН, старшыня Мінаблвыканкама:

«На асабістых прыёмах грамадзян людзям трэба даваць простыя і зразумелыя адказы, а не спасылацца на вялікую колькасць нарматыўна-прававых актаў. Важна разумець, што тая ці іншая сфера можа быць добра знаёмая аднаму і зусім незразумелая другому чалавеку. А значыць, сутнасць адказу грамадзянам можа быць незразумелая. А для больш эфектыўнага вырашэння праблем на асабістыя прыёмы грамадзян трэба запрашаць як мага больш кіраўнікоў ведамасных аддзелаў, галіновых арганізацый і прадпрыемстваў. Гэта дазволіць пачуць розныя меркаванні адносна пытання, атрымаць некалькі варыянтаў вырашэння праблемы».

Каласок да каласка

Ёсць шэсць мільёнаў!

Беларускія аграрыі намалацілі прыкладна 5,9 мільёна тон збожжа, паведаміў учора Telegram-канал Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Няма сумненняў, што цяпер, калі чытачы знаёмяцца з гэтай інфармацыяй, паказчык гарантавана складае ўсе 6 мільёнаў.

На раніцу ўчарашняга дня збожжавыя і зернебабовыя культуры (без кукурузы, грэчкі і проса) былі ўбраныя з 1,9 мільёна гектараў, што складае 90,8 працэнта запланаванай плошчы.

Па намалоце лідзіруе Мінская вобласць — больш як 1,4 мільёна тон, далей ідуць Брэсцкая вобласць — 1,1 мільёна тон, Гродзенская — 960,5 тысячы тон. У Магілёўскай вобласці намалочана 825,5 тысячы тон, у Гомельскай — 740,1 тысячы тон, у Віцебскай — 721,4 тысячы тон. Дзяржзаказ па збожжы ў Беларусі выкананы на 83,2 працэнта, пастаўлена 691,9 тысячы тон. Зразумела, што з учарашняга дня ўсе гэтыя лічбы павялічыліся.

Фота БелТА.

Аграрыі Магілёўскага раёна першыя ў вобласці намалацілі 100 тысяч тон збожжа. Учора іх павіншавалі старшыня Магілёўскага аблвыканкама Леанід Заяц і старшыня Магілёўскага райвыканкама Алег Чыкіда.

Важкі ўклад у агульны каравай Магілёўшчыны ўнеслі і аграрыі Бялыніцкага раёна. Першы адзнаку ў 4 тысячы тон па намалоце збожжавых і зернебабовых перавысіў экіпаж старшага камбайнера Мікалая Дарэчкіна і камбайнера Канстанціна Саладухі з СВК «Калгас «Радзіма». Механізатары сталі абсалютнымі лідарамі ў рэгіёне.

На здымку: **старшы камбайнер СВК «Калгас «Радзіма» Мікалай Дарэчкін.**

КАРАТКА

- У Мінскім паўмарафоне змогуць прыняць удзел да 10 тысяч аматараў бегу.
- **У мэтах папярэджання ДТЗ па прычыне перавышэння хуткасных рэжымаў Дзяржаўтаінспекцыя Мінскай вобласці з 19 да 22 жніўня правядзіць прафілактычную акцыю «Хуткасць».**
- У Магілёўскай вобласці з пачатку лета знішчана 8 тон наркатычных раслін.
- **Абласны фестываль творчасці інвалідаў пройдзе ў Магілёве 2 верасня.**
- Аплаціць праезд з дапамогай смартфона цяпер можна ў аўтобусах Гомеля.
- **Беларусь і В'етнам дамовіліся аб больш актыўным супрацоўніцтве ў сферы турызму.**

ISSN 1990 — 763X

Расклад на паслязаўтра

«ЯКАСЦЬ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ — ВЫШЭЙШАЯ ЗА ЎСЁ»

Як БДУФК выхоўвае спартыўныя таленты

Іван Літвіновіч, Максім Недасекаў, Аліна Гарнасько — спартсмены, якіх аб'ядноўвае не толькі поспех на нядаўніх Алімпійскіх гульнях у Токіа, але і тое, што яны студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры. Для спартыўнага ўніверсітэта гэтае лета выдалася асабліва насычанае, паралельна з Алімпіядай ішла прыёмная кампанія. У час алімпійскага лета яна, зразумела, была асаблівая. «Звязда» даведалася падрабязнасці.

СТАР. 4

Рэктар БДУФК Сяргей РЭПКІН.

За чысціню асяроддзя

КАЛІ ЛЕКІ СТАНОВЯЦЦА НЕБЯСПЕЧНЫЯ

Грамадская кампанія «Прырода без фармацэўтычных адходаў», якая стартавала ў Баранавічах, набывае прыхільнікаў па ўсёй краіне

Усе мы перыядычна купляем лекі. І ў кожнай хатняй аптэчцы, відаць, можна знайсці прэпараты, у якіх скончыўся тэрмін прыдатнасці. Часцей за ўсё падчас генеральнай прыборкі ці рэвізіі гаспадыні выкідваюць пратэрмінаваныя лекі... у сметніцу. Такім чынам мы не проста шкодзім прыродзе, а закладваем своеасаблівую бомбу запаволенага дзеяння — пад здароўе не толькі сваё, але і нашчадкаў.

СТАР. 13

Абноўленую Канстытуцыю да 1 верасня накіруюць Прэзідэнту

Праект новага Асноўнага Закона ў хуткім часе перададуць на разгляд кіраўніку краіны. Пра гэта паведаміў старшыня Канстытуцыйнага суда, старшыня Канстытуцыйнай камісіі Пётр МІКЛАШЭВІЧ, перадае БелТА.

«Мы сёння прынялі дакумент. Зараз пройдзе рэдакцыйная вычытка, і ва ўстаноўленым парадку мы накіруем гэты дакумент Прэзідэнту. Гэта значыць да 1 верасня, — канстатаваў ён. — Далей мы чакаем, што пройдзе пасяджэнне Канстытуцыйнай камісіі ўжо з удзелам кіраўніка дзяржавы. Будуць разглядацца канкрэтна тыя прапановы, якія прадстаўлены Канстытуцыйнай камісіяй, шэраг спрэчных пытанняў, звязаных з фарміраваннем Усебеларускага народнага сходу, смяротным пакараннем, правамі працоўных калектываў вылучаць кандыдатаў у дэпутаты. Гэтыя пытанні таксама будуць прадметам разгляду на пасяджэнні Канстытуцыйнай камісіі з удзелам Прэзідэнта».

Як распавёў Пётр Міклашэвіч, можна канстатаваць, што Канстытуцыйная камісія прапануе змяніць 53 артыкулы Канстытуцыі, увесці 14 новых артыкулаў і 2 артыкулы выключыць. Камісія рэкамендуе захаваць прэзідэнцкую форму праўлення, правесці перараз мяркаванне паўнамоцтваў паміж Прэзідэнтам, парламентам і ўрадам.

«Прапануецца замацаваць і ўстанавіць канстытуцыйны статус Усебеларускага народнага сходу — гэта новы орган у сістэме дзяржаўнай улады. Тут задача была знайсці той аптымальны варыянт, каб орган з дарадчага стаў канстытуцыйна-ўладным. З іншага боку, Усебеларускі народны сход не павінен парушыць існуючую сістэму ўлады, а павінен стаць стабілізуючым органам для ўстойлівасці ўсёй сістэмы дзяржаўнай улады, найважнейшым паўнамоцтвам яго было якраз вырашэнне стратэгічных пытанняў далейшага развіцця нашай краіны».

Пётр Міклашэвіч паведаміў, што ішла шырокая дыскусія наконт таго, ці пакінуць ранейшы парадак фарміравання Усебеларускага народнага сходу, бо прапаноўваліся іншыя варыянты. Ён дадаў: «З аднаго боку, гэты орган павінен быць з шырокім прадстаўніцтвам народа. Сама назва пра гэта кажа — Усебеларускі народны сход. З другога боку, павінен быць пільны адбор дэлегатаў УНС, паколькі ім прыйдзецца вырашаць канстытуцыйна значныя пытанні развіцця нашай краіны, развіцця грамадства і дзяржавы».

Як адзначыла **старшыня Пастаяннай камісіі па заканадаўстве Палаты прадстаўнікоў, член Канстытуцыйнай камісіі Святлана ЛЮБЕЦКАЯ,** у выніку разгляду розных меркаванняў неабходна выпрацаваць універсальную формулу: «Якое будзе прадстаўніцтва, якога ўзроўню. Сапраўды трэба казаць пра тое, каб усё насельніцтва было прадстаўлена, каб ахоплены былі як раёны з невялікай колькасцю насельніцтва, так і той жа горад Мінск. Прычым прадстаўлены самыя розныя слаі грамадства, самыя розныя сацыяльныя зрэзы, і гэта таксама трэба максімальна ўлічваць».

Таксама, паводле слоў Пятра Міклашэвіча, прапануецца канкрэтызаваць канстытуцыйныя асновы выбарчай сістэмы — падняць статус Цэнтральнай выбарчай камісіі, стварыць умовы для поўнай рэалізацыі выбарчых правоў нашых грамадзян. Акрамя таго, прапануецца ўзмацніць сацыяльныя гарантыі шматдзетных сем'яў, інвалідаў, пенсіянераў. «Мяркуецца ўвесці новы праваабарончы інстытут — упаўнаважанага па правах чалавека, а таксама пашырыць правы нашых грамадзян на непасрэдны зварот у Канстытуцыйны суд, гэта значыць на падачу канстытуцыйнай скаргі непасрэдна ў КС», — падкрэсліў Пётр Міклашэвіч.

Ва ўрадзе

ЭКАНОМІКА: РОСТ ЯКАСНЫ

Прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА падвёў вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны ў першым паўгоддзі падчас пасяджэння Савета Міністраў, перадае карэспандэнт БелТА.

«З шасці асноўных паказчыкаў работы ўрада і Нацыянальнага банка ў першым паўгоддзі выкананы чатыры. Выніковы паказчык працы ўсёй эканомікі — рэальныя наяўныя даходы насельніцтва — за студзень—май павялічыўся на 3,5 %, што вышэй за прагноз. На працягу паўгоддзя ўстойліва расла заработная плата: у чэрвені выйшлі на ўзровень больш Br1400, рост у рэальным выражэнні на 5,6 %», — сказаў Раман Галоўчанка.

Паводле яго слоў, паступальна вырашаецца задача павышэння даходаў у бюджэтнай сферы, у першую чаргу гэта датычыцца педагагічных работнікаў і прадстаўнікоў аховы здароўя. «Мэтавы арыенцір выкананы: суадносіны зарплаты бюджэтнікаў з сярэднім па краіне склалі больш за 81 %. У адпаведнасці з рашэннем урада з 1 жніўня, на 1,5 % павялічана базавая стаўка аплаты працы бюджэтнікаў. Дзякуючы стварэнню ўмоў па забеспячэнню ўстойлівай работы рэальнага сектара эканомікі не дапушчана росту беспрацоўя», — адзначыў прэм'ер-міністр.

Раман Галоўчанка звярнуў увагу на тое, што ў знешнім гандлі захоўваецца як збалансаванасць, так і высокія тэмпы росту экспарту. «Знешнегандлёвае сальда за шэсць месяцаў у плюсе — $1,73 млрд. Своечасова і ў поўным аб'ёме забяспечаны выплаты па знешніх і ўнутраных абавязацельствах, у прагнозных параметрах захаваны золатавалютныя рэзервы», — дадаў ён.

«У цэлым вынікі працы за мінулы перыяд сведчаць аб якасным росце эканомікі: тэмп росту ВУП — 103,3 %», — рэзюмаваў прэм'ер-міністр.

Акцэнты

«З вамі — стабільнасць, развіццё, а галоўнае — народ!»

Што пішуць звычайныя людзі — беларусы і замежнікі — кіраўніку дзяржавы пасля прагляду «Вялікай размовы».

***

Пачну з таго, што я звычайная маці дзвюх дачок, мне 30 гадоў. Паглядзела «Вялікую размову». Я вельмі далёкая ад пытанняў палітыкі, але тое, што адбываецца апошнім часам у нашай краіне, на яе граніцах, і за яе межамі, не можа не хваляваць. Гэта страшна. Не магу зразумець і не разумею тых людзей, якія скардзяцца на сваё «беднае» жыццё, маючы тры асабістыя аўто, маючы дамы, лецішчы, кватэры, слухаць, як у нас усё дрэнна.

Я не хачу пісаць вам гучных слоў, а хочацца сказаць проста і ад усяго сэрца: Вам цяпер вельмі цяжка, цяпер усё вакол супраць нашай краіны, супраць народа, супраць Вас. Але асабіста хачу выказаць Вам вялікую падзяку за тое, што змаглі захаваць у нас мір і спакой, дзякуй Вам, што мае дзяўчынкі жывуць у спакойнай краіне, у якой можна вучыцца, займацца спортам, развівацца і спакойна гуляць на вуліцы. Хачу пажадаць Вам моцнага здароўя, стойкасці і мэтанакіраванасці! І вельмі хочацца, каб і мае дзеці, ужо будучы дарослымі, жылі ціха і спакойна. Я за сябе не баюся, баюся за іх, за іх будучыню.

Здароўя Вам і Вашай сям'і, дабрабыту і цяпла, міру і працвітання!

Анастасія Юхо, Капыль.

***

Шчыра ўдзячны Вам за ўсё, што Вы зрабілі для нашай Радзімы і для нас — беларусаў, і не пакінулі нас на разарванне ў цяжкі перыяд! Ад усёй душы жадаю Вам моцнага здароўя, жыццёвых сіл і даўгалецця! Вы нам вельмі патрэбныя!

Церашчук Ігар Віктаравіч, Мінск.

***

Дазвольце Вам сардэчна падзякаваць за тое, што Вы адстойваеце інтарэсы сваёй дзяржавы і свайго народа! Прайшоў роўна год з тых самых часоў, калі Захад пачаў адкрытую вайну супраць Беларусі. Было вельмі прыемна глядзець на Вас, на Вашу імгненную рэакцыю, калі тыя спрабавалі разгайдаць сітуацыю ў краіне. А Ваш выхад на мітынгу 16 жніўня зрабіў каласальны эфект. Вы — сапраўдны мужык і самы лепшы прэзідэнт!

Я не ведаю іншага кіраўніка дзяржавы, такога ж моцнага, незалежнага, які б змог пабудаваць сапраўды цудоўную Рэспубліку. З вамі — стабільнасць, з вамі — развіццё, а галоўнае — народ. Але народ не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі.

Не ўсе студэнты слепа ідуць па закліку разбуральнікаў. Я — студэнт, мы, студэнты (гісторыкі), многае разумеем. І ў нас у краіне ёсць тыя, з якімі і «на адным кіламетры не прысесці», як кажуць у народзе. Нашы краіны павінны быць разам, гэта — галоўная мара. Мы Вас падтрымліваем і моцна, па-мужчынску, ціснем руку!

Катрушэнкаў Марк Уладзіміравіч, Масква.

***

Мне 12 гадоў. Жыву на Урале, у Чэлябінску. Захоплены Вамі як прэзідэнтам. У панядзелак 8 гадзін слухаў Вашу канферэнцыю і ва ўсім я згодны з Вамі. Вы — сапраўдны, мужны, смелы, прыстойны, сумленны чалавек, патрыёт Беларусі. Мой горад вельмі далёка ад Мінска. Але я вырасту, зараблю грошай і абавязкова прыеду ў Мінск і Брэсцкую крэпасць, дзе загінулі мае прадзеды. Здароўя Вам і Вашым блізкім і доўгіх, доўгіх гадоў жыцця.

Кудрашоў Рыгор Уладзіміравіч, Урал, г. Чэлябінск.

***

Я як беларуска па крыві захапляюся Вамі, Вы сапраўдны Прэзідэнт, смелы і дасведчаны. Вельмі шкада, што на Вас ідзе атака з Захаду, і абвінавачваюць вас у сваіх жа брудных справах. Беларусі вельмі пашанцавала з Прэзідэнтам, жадаю Вам усіх перамагчы і заставацца на пасадзе Прэзідэнта яшчэ вельмі шмат гадоў. Вы малайчына.

Ірына Яўгенаўна Маер, Казахстан, г. Паўладар.

***

Хачу Вам пажадаць моцнага здароўя, вытрымкі і цярпення ў адносінах да нас, украінцаў. Такая ўжо ў нас карма, што краінай кіруюць пяць працэнтаў і за акіянам выконваюцца рашэнні, якія разбураюць краіну, прамысловасць і саму дзяржаву, Вы і самі гэта ведаеце.

Паглядзеў на Вашу прэс-канферэнцыю. Трымайцеся, не паддавайцеся на правакацыі. Верым, шчыра паважаем, давяраем, беражыце сябе.

Яфіменка А. В., Украіна, Харкаў.

Блізкая ўлада

ПАЧУЦЬ «ГЛЫБІНКУ»

Просьбы падтрымаць ініцыятывы па развіцці сельгасбізнесу і надзеі на дапамогу ў вырашэнні сямейных праблем — гэтыя і іншыя хвалюючыя пытанні і прапановы адрасавалі жыхары Акцябрскага раёна старшыні Гомельскага аблвыканкама Генадзю САЛАЎЮ. Кіраўнік рэгіёна правёў у райцэнтры прамую тэлефонную лінію і прыём грамадзян.

Фота БелТА.

Было прынята рашэнне адзін з тэлефонных зваротаў, агучаных жыхаркай райцэнтра, разгледзець адразу, з выездам на месца. Увага — да трох аднолькавых двухпавярховых чатырохкватэрных дамоў па вуліцы Савецкая. Па словах заяўніцы, у адным з іх на другі паверх не праведзена вада, ацяпленне — пячное. Суседзі знізу не даюць дазволу правесці камунікацыі... Хвалюючую праблему дэталёва прапрацаваць і прапанаваць магчымыя варыянты яе вырашэння — такое даручэнне даў кіраўнік рэгіёна.

Раённым службам даручана даць тлумачэнні па звароце шматдзетнага бацькі, жыхара гарадскога пасёлка Акцябрскі. Мужчына прасіў разабрацца ў сітуацыі, у якой апынулася яго сям'я. З дапамогі на дзіця, што атрымлівае жонка заяўніка, утрымліваюцца залішнія сродкі. Прычына — атрымальніца дапамогі ў дэкрэтным водпуску не падала заяву на прыпыненне прадпрымальніцкай дзейнасці. Заяўнік падзяліўся і іншымі перажываннямі: яго жонка пасля дэкрэтанага павінна выйсці на асноўнае месца працы — Акцябрскі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва.

— Ёсць інфармацыя, што работу цэнтра закрануць змены, аптымізацыя кадраў. Перажываю, што жонку скароцяць, яна застанецца без работы, — растлумачыў заяўнік. Па агучаных пытаннях сям'я атрымае падрабязныя рэкамендацыі, запэўніў Генадзь Салавей.

Да губернатара са сваёй праблемай звярнулася супрацоўніца крамы ў вёсцы Новая Дуброва Акцябрскага раёна. Жанчына распавяла, што ніяк не можа спагнаць доўг — больш за 780 долараў. Даўжніца — маці траіх дзяцей — раней брала таварныя крэдыты і заўсёды іх пагашала, цяпер не працуе і вярнуць грошы, кажа, не можа. Варыянты вырашэння праблемы будуць разглядаць адказныя службы.

Да кіраўніка рэгіёна звярнуліся таксама жыхары райцэнтра з прапановай развіцця фермерскай гападаркі. Заяўнікі маюць намер развіваць адпаведную дзейнасць у аграгарадку Парэчча, а для гэтага ім патрэбныя дадатковыя тэрыторыі.

— Мы займаемся раслінаводствам, вырошчваем гародніну, бульбу. Хочам займацца жывёлагадоўляй — малаком, мясам. Гэта прыбытковы перспектыўны напрамак, — упэўненыя фермеры.

Генадзь Салавей прыняў рашэнне наведаць гаспадарку і азнаёміцца, як наладжана работа на месцы.

— Калі вы плануеце развіваць жывёлагадоўлю, з землямі дапаможам. Складайце бізнес-план, вывучайце перадавы вопыт, новыя тэхналогіі, — заклікаў фермераў да кантрэтных крокаў старшыня аблвыканкама.

Наталля КАПРЫЛЕНКА.

У цэнтры ўвагі

Стандарт жыцця грамадства Беларусі — двух-трохдзетная сям'я

Каля 80 % насельніцтва Беларусі жыве ў сем'ях, а 98 % жыхароў лічаць яе найважнейшай часткай жыцця. Гэта заканамерна, бо шчаслівая сям'я — адзін з прыярытэтаў праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі і аснова развіцця нацыі, упэўненая Марына АРЦЁМЕНКА, начальнік упраўлення народанасельніцтва, гендарнай і сямейнай палітыкі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны.

У краіне 1 млн 143 тысячы сем'яў з непаўналетнімі дзецьмі, дзе выхоўваецца 1 млн 767 тысяч дзяцей. У 57 % сем'яў — адно дзіця, у 33,5 % — двое, 9,2 % — шматдзетныя. А змены ў структуры ячэек грамадства пазітыўныя. За апошняе дзесяцігоддзе на 43 тысячы вырасла колькасць сем'яў з двума малымі. Цяпер кожная трэцяя сям'я ў краіне — двухдзетная. На столькі ж выраслa і лічба шматдзетных сем'яў, дзе цяпер жыве пятая частка непаўналетніх беларусаў. Можна лічыць, што двух-трохдзетная сям'я стала сацыяльнай нормай, стандартам жыцця грамадства Беларусі, мяркуе спецыяліст:

— Выбудаваная ў краіне сістэма сацыяльнай падтрымкі — па сутнасці, візітная картка Беларусі. Падтрымка гэтая вельмі разнапланавая. Яна датычыцца сферы жыллёвага будаўніцтва, развіцця паслуг па доглядзе дзяцей, сацыяльнага абслугоўвання, гарантыі льгот у сферы адукацыі, аховы здароўя, пенсійнага, працоўнага і падатковага заканадаўства.

Стабільная і роўная падтрымка сем'яў у перыяд нараджэння і выхавання дзяцей да трох гадоў. Дапамога выдаецца на кожнага чацвёртага малога (амаль 450 тысяч дзяцей). Штогод апошнія пяць гадоў расходы на дзяржаўныя дапамогі ў Беларусі складаюць 1,8 % ад ВУП. На наступную пяцігодку мяркуецца накіраваць на гэта каля 16 млрд рублёў. 1 жніўня лічбы дапамог, дарэчы, ізноў падраслі: на першае дзіця да трох гадоў цяпер прадугледжана амаль 500 рублёў, на другое і наступнае — 567, нагадала Марына Арцёменка.

Важная і адрасная сацыяльная дапамога для сем'яў, якія аказаліся ў складаных жыццёвых сітуацыях. Яе асноўная форма — штомесячныя сацыяльныя дапамогі (95 рублёў на аднаго атрымальніка), аднаразовая сацыяльная дапамога (152 рублі) і бясплатнае харчаванне дзяцей першых двух гадоў жыцця (сярэдні кошт набору харчавання — 122 рублі).

— Летась узмацнілася адрасная дапамога шмтадзетным, — удакладніла прадстаўніца міністэрства. — Яны цяпер могуць атрымліваць штомесячную сацыяльную дапамогу не шэсць месяцаў, а ўвесь год. Акрамя таго, ім павысілі крытэрый патрэбнасці да 115 % бюджэту пражыткоўка мінімуму.

Праграмы сацыяльнага абслугоўвання — яшчэ адзін напрамак сацпадтрымкі. Сёння дзейнічаюць 146 тэрытарыяльных цэнтраў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, дзе на ўліку больш за 257 тысяч сем'яў.

— У цэнтрах ёсць даволі запатрабаваныя паслугі, у прыватнасці, нянькі. Сёлета такой паслугай скарысталася ўжо амаль 2000 сямей. Права атрымаць няньку з гэтага года маюць усе сем'і, дзе выхоўваюцца інваліды да 18 гадоў, пры ўмове, што такое дзіця даглядае адзін з бацькоў і малы навучаецца дома. Для сем'яў, дзе выхоўваюцца дзеткі з асаблівасцямі, аказваецца паслуга сацыяльнай перадышкі (да 56 каляндарных дзён), якая таксама актыўна развіваецца. Пры гэтым права на ўсе сацыяльныя выплаты і дапамогі за сям'ёй захоўваюцца. Для сем'яў, якія знаходзяцца ў складанай жыццёвай сітуацыі і маюць патрэбу ў падтрымцы, прадугледжаны сацыяльны патранат. Сёлета гэтым скарысталіся 1586 сем'яў.

Ірына СІДАРОК.

Стыхія

НАВАЛЬНІЧНЫ ФРОНТ НАРАБІЎ БЕД

Паводле аператыўных даных, з прычыны праходжання навальнічнага фронту з парывамі ветру (большымі за 25 м/с) 17 жніўня пацярпеў 31 населены пункт у Брэсцкай, Віцебскай, Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцях, а таксама Мінск, паведамляе МНС.

У выніку на тэрыторыі Мінскай вобласці адбыліся падзенні дрэў. Ратавальнікі больш за 30 разоў выязджалі на распілоўку дрэў у Вілейскім, Клецкім, Крупскім, Мінскім, Пухавіцкім, Уздзенскім, Маладзечанскім, Капыльскім, Валожынскім, Дзяржынскім раёнах. У Мінскім раёне ў выніку падзення дрэва пацярпеў пенсіянер. Мужчыне аказалі дапамогу мясцовыя жыхары, ён быў дастаўлены ў бальніцу.

У гэты дзень былі пашкоджаны дахі 32 жылых дамоў, 23 сельскагаспадарчыя будынкі ў Вілейскім, Крупскім, Уздзенскім, Маладзечанскім, Капыльскім, Дзяржынскім і Мінскім раёнах.

Стыхія закранула і Віцебшчыну: Чашніцкі, Гарадоцкі, Віцебскі, Бешанковіцкі раёны, а таксама абласны цэнтр. Ратавальнікамі і іншымі службамі праводзіліся аднаўленчыя работы.

Пашкоджаны дахі 22 шматкватэрных і прыватных жылых дамоў, 15 аб'ектаў сельскагаспадарчага прызначэння, аднаго вытворчага памяшкання. Зафіксаваныя 160 выпадкаў падзенняў дрэў, пашкоджаны 21 легкавы аўтамабіль. Для ліквідацыі наступстваў непагадзі прыцягнута 18 адзінак аварыйна-выратавальнай тэхнікі і больш за 60 чалавек асабовага складу падраздзяленняў МНС вобласці.

Па даных «Віцебскэнерга», былі зафіксаваны адключэнні электразабеспячэння ў 511 населеных пунктах вобласці.

У Новалукомлі паваленым дрэвам прыціснула мясцовую жыхарку. Яна была дастаўлена ў бальніцу. Цяпер яе здароўю нічога не пагражае.

У Віцебскім раёне былі часткова пашкоджаны дахі птушнікаў і складскіх будынкаў Віцебскай бройлернай птушкафабрыкі.

У Мінску былі зафіксаваныя інтэнсіўнае выпадзенне ападкаў у выглядзе дажджу (па горадзе выпала месцамі ад 10 да 20 мм) і моцны вецер парывамі да 15 м/с.

У выніку непагадзі адбылося частковае падтопліванне праезных частак і абмежаванне руху грамадскага транспарту (тры аўтобусныя, 18 тралейбусных і пяць трамвайных маршрутаў).

Работнікі МНС выязджалі на аказанне дапамогі па распілоўцы дрэў, якія зваліліся (49 выпадкаў) на праезныя часткі і аўтамабілі (23 транспартныя сродкі пашкоджаны), у адным выпадку — па дэмантажы аварыйных лістоў бляхі з даху жылога дома.

З-за непагадзі адбылося падзенне двух білбордаў на скрыжаванні вуліц Глебкі і Матусевіча і на праспекце Дзяржынскага, а таксама адной дзіцячай пластыкавай гульнявой пляцоўкі на праспекце Пераможцаў.

Сяргей РАСОЛЬКА.
Фота з сайта МНС.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Заява Макрона аб абароне ад афганскіх бежанцаў выклікала хвалю крытыкі ў Францыі

Прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон у сваім выступленні, прысвечаным сітуацыі ў Афганістане, заявіў аб намеры абмежаваць паток мігрантаў з гэтай краіны. Выказванні прэзідэнта Францыі неадкладна падвергнуліся крытыцы ў сацсетках з боку левых партый, паведамляе французскі тэлеканал BFM TV.

«Мы павінны прадбачыць буйныя нерэгулюемыя патокі мігрантаў, якія могуць падвяргаць небяспецы тых, хто іх прымае, і абараніць сябе ад іх», — сказаў Эмануэль Макрон. Прэзідэнт таксама падкрэсліў, што дэстабілізацыя ў Афганістане можа прывесці да нерэгулюемых патокаў мігрантаў у Еўропу.

Французскі лідар запэўніў, што Францыя будзе ўдзельнічаць у ініцыятыве, арганізаванай на міжнародным узроўні. «Францыя выконвае і будзе працягваць выконваць свой абавязак па абароне тых, хто падвяргаецца найбольшай пагрозе», — адзначыў Эмануэль Макрон.

Каментарыі прэзідэнта Францыі неадкладна падверглася крытыцы з боку іншых палітыкаў у сацыяльных сетках. Лідар партыі «Еўропа Экалогія Зялёныя» Жульен Баю ў адказ на словы прэзідэнта напісаў на сваёй старонцы ў Twitter: «А як жа права на прыстанішча? А як жа гэтыя дзеці, гэтыя жанчыны, гэтыя мужчыны, якія ратуюцца ад жаху? Францыя павінна адыграць сваю ролю, патрэбныя канкрэтныя дзеянні».

Мэр Грэнобля, абаронца навакольнага асяроддзя, які можа стаць кандыдатам на наступных прэзідэнцкіх выбарах, Эрык Піяле таксама выступіў з крытыкай на адрас прэзідэнта: «Ён хоча, каб людзі заставаліся там. Яму ўсё роўна». У загалоўку відэа, размешчанага ў Twitter, мэр абвясціў: «Макрон ганьбіць Францыю!»

Дэпутат Еўрапарламента, французскі палітык і эколаг Янік Жадо таксама адрэагаваў на словы французскага лідара. «Ашаломлены, пачуўшы, як Эмануэль Макрон заяўляе, што жанчыны, мужчыны і дзеці, якія бягуць з пекла «Талібана», у першую чаргу ўяўляюць з сябе пагрозу», — сказаў Янік Жадо.

Пасля выводу асноўнай часткі заходняга вайсковага кантынгенту з Афганістана рух «Талібан» разгарнуў маштабную аперацыю па ўсталяванні кантролю над краінай. Баевікі руху 15 жніўня без бою ўвайшлі ў Кабул і на працягу некалькіх гадзін устанавілі поўны кантроль над афганскай сталіцай.

«Катастрафічны сыход адміністрацыі прэзідэнта ЗША Байдэна з Афганістана — гэта знешнепалітычнае прыніжэнне, якое краіна не перажывала з часоў іранскага крызісу з заложнікамі» (Майкл Пэн, былы віцэ-прэзідэнт ЗША).

Замежнікі масава перасталі наведваць Расію

Па выніках першага паўгоддзя 2021 года, у Расіі пабывала 64,4 тысячы падарожнікаў, што ў 31 раз менш у параўнанні з аналагічным перыядам 2019-га. Пра тое, што замежныя грамадзяне масава перасталі наведваць РФ, паведамляецца на сайце Асацыяцыі тураператараў Расіі.

Пры гэтым лідарам уязнога турпатоку ў першым паўгоддзі гэтага года стала Куба, грамадзяне якой перасякалі граніцу Расіі 20,5 тысячы разоў. На другім месцы — ААЭ. За шэсць месяцаў з турыстычнымі мэтамі ў РФ пабывалі 8,8 тысячы адпачывальнікаў з гэтай краіны. Тройку лідараў замыкае Турцыя, жыхары якой са студзеня да чэрвеня 2021 года ажыццявілі 7,3 тысячы візітаў.

«Турпаток працягвае стрымліваць пандэмія, у першую чаргу тое, што РФ аднесена ў многіх краінах да чырвонай зоны рызыкі: нашу краіну не рэкамендуюць да наведвання, а пасля наведвання турыстам давядзецца прайсці двухтыднёвы каранцін у сябе дома», — расказаў прадстаўнік агенцтва «Інтурыст», звярнуўшы ўвагу, што нават нягледзячы на падобныя складанасці, уязны турызм паступова пачынае аднаўляцца.

Пасылка з падманам

Гродзенец прадаў жыхарцы Гомельскай вобласці замест новага касцюма той, што быў у карыстанні

Жанчына вырашыла абнавіць свой гардэроб, набыўшы новы спартыўны касцюм вядомай маркі «Nike». Аб'яву аб продажы яна знайшла на адной з гандлёвых пляцовак у інтэрнэце. Зацікавіўшыся таварам, звязалася з прадаўцом, жыхаром Гродна. У працэсе перагавораў дамовіліся аб цане. Жанчына афармліла заказ і праз некаторы час у аддзяленні паштовай сувязі забрала пасылку. Касцюм абышоўся ёй у 173 рублі.

Падман выявіўся пасля таго, як была раскрыта пасылка. Зусім не тое меркавала яна ўбачыць. Перад ёй аказаўся спартыўны касцюм, які відавочна быў у карыстанні, прытым зусім іншай гандлёвай маркі. Пакупніца патэлефанавала прадаўцу з патрабаваннем вярнуць грошы, але той адмовіўся. Пасля гэтага жанчына звярнулася з заявай у міліцыю. Для ўстанаўлення кошту тавару была прызначана таваразнаўчая экспертыза. Паводле яе ацэнкі, кошт спартыўнага касцюма з маркіроўчнымі знакамі «Adidas», які быў у пасылцы, складае амаль 64 рублі. Згодна з вывадамі эксперта, таварам карысталіся, і ён не адносіцца да арыгінальнай прадукцыі вядомай гандлёвай маркі. Па дадзеным факце міліцыя правядзіць праверку.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

«ЯКАСЦЬ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ — ВЫШЭЙШАЯ ЗА ЎСЁ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«У Токіа выступалі 19 нашых студэнтаў і мы радаваліся за кожнага. Я сам як спартсмен разумею, што ўдзел у Алімпійскіх гульнях — гэта мара кожнага атлета. І высокія вынікі застаюцца на ўсё жыццё, гэтымі дасягненнямі жыве краіна. Я вельмі рады за нашых студэнтаў», — дзеліцца ўражаннямі **рэктар БДУФК Сяргей РЭПКІН,** доктар эканамічных навук, дацэнт, — Калі я глядзеў фінал у скачках на батуце, злавіў сябе на думцы, наколькі цяжка выступаць апошнім, калі бачыш добрыя вынікі сапернікаў. Іван Літвіновіч з гэтым справіўся. Максім Недасекаў выступіў на сваёй максімальнай вышыні. Аліна Гарнасько таксама вялікая малайчына. Хочацца выказаць сваю павагу спартсменам, што яны змаглі паказаць моцны псіхалагічны настрой, упэўненасць і такія вынікі. Мабыць, яны толькі праз час усвядомяць, што зрабілі для сябе, для свайго спорту і для краіны, і для ўніверсітэта, вядома. Падчас прыёмнай кампаніі ў нас у кожным корпусе працавалі тэлевізары. Калі выступаў Ваня Літвіновіч, мы на пяць хвілін пазней пачалі прыём уступных іспытаў, бо ўсе чакалі выніку. Я зайшоў у залу складанакаардынацыйных відаў, дзе праходзілі іспыты па гімнастыцы, пачуў воклічы і зразумеў, што Ваня — чэмпіён», — расказвае Сяргей Рэпкін.

ТРЭНЕРЫ — У ПЕРШУЮ ЧАРГУ

Такія поспехі спартсменаў-студэнтаў — дадатковая матывацыя для абітурыентаў, асабліва для тых, хто хоча звязаць сваю прафесійную будучыню з трэнерскай работай. У БДУФК рыхтуюць трэнераў па 42 відах спорту. Гэта адзіная ВНУ ў краіне, дзе на кожную групу відаў спорту прыходзіцца асобная кафедра. Але, як расказала **прарэктар па вучэбнай рабоце Алена ФІЛЬГІНА,** самай папулярнай спецыяльнасцю сярод абітурыентаў аказалася не трэнерская дзейнасць, а «менеджмент у турызме» з конкурсам 4,25 чалавека на месца. Аднак універсітэт робіць акцэнт менавіта на падрыхтоўцы трэнерскіх кадраў. Менавіта на дадзены накірунак вылучаецца найбольшая колькасць бюджэтных месцаў.

«Сёлета на спецыяльнасці, звязаныя з трэнерскай дзейнасцю, мы залічылі 604 абітурыенты, на ўсе формы навучання — 1197 чалавек, то-бок 50 % абітурыентаў былі залічаны на трэнерскую работу. Конкурс атрымаўся 1,53 чалавека на месца, гэтыя спецыяльнасці дастаткова запатрабаваныя», — прыводзіць лічбы Алена Васілеўна.

Студэнты БДУФК.

Сяргей Рэпкін падкрэсліў, што ўніверсітэт кожны год працуе па мэтавым наборы абітурыентаў. Сёлета ў ВНУ паступіла больш за 140 мэтавых заявак з усіх рэгіёнаў краіны. «Мы кропкава закрываем патрэбу ў трэнерскіх кадрах ва ўсіх рэгіёнах», — адзначае рэктар.

Рашэнне праблемы кіраўніцтва ўніверсітэта бачыць у супрацоўніцтве з федэрацыямі па відах спорту. Толькі разам БДУФК і спартыўныя федэрацыі могуць праводзіць плённую прафарыентацыю.

Самымі запатрабаванымі ў абітурыентаў аказаліся лёгкая атлетыка, плаванне, баскетбол, валейбол, гандбол, хакей і футбол. Вызначаецца папулярнасць спецыяльнасцяў па колькасці падаздзеных заяў. Менш цікавыя для абітурыентаў шахматы і фехтаванне. Атрымліваецца, што віды спорту, якія традыцыйна радуюць высокімі дасягненнямі, больш цікавяць моладзь. «Лагічна, што на віды спорту, якія патрабуюць развіцця, меншы набор. Мала маладых людзей займаецца, адпаведна, мала паступае, і мы не можам актыўна рыхтаваць трэнераў», — тлумачыць Алена Васілеўна. Рашэнне праблемы кіраўніцтва ўніверсітэта бачыць у супрацоўніцтве з федэрацыямі па відах спорту. Толькі разам БДУФК і спартыўныя федэрацыі могуць праводзіць плённую прафарыентацыю. «Федэрацыі ведаюць рэгіёны, дзіцяча-юнацкія спартыўныя школы, іншыя арганізацыі, дзе трэніруюцца спартсмены, якія могуць стаць нашымі абітурыентамі. Мы ўжо праводзілі семінары разам з федэрацыямі, прадстаўлялі напрамкі, у якіх можам сумесна працаваць. І спартыўныя федэрацыі адгукнуліся, ім таксама гэта цікава і важна», — адзначае прарэктар па вучэбнай рабоце.

ЧЭМПІЁНСКАЯ АДУКАЦЫЯ

Амаль усе спартсмены пасля заканчэння школы падаюць дакументы менавіта ў БДУФК. Практычныя веды і вопыт дазваляюць, а ўніверсітэт падмацоўвае гэта тэорыяй. Сёння ў БДУФК вучыцца 558 членаў нацыянальных і зборных камандаў. А чэмпіёны свету і Еўропы, якія перамаглі ў год паступлення, могуць паступіць ва ўніверсітэт без уступных іспытаў. Але не факт, што з выдатнага спартсмена атрымаецца вялікі трэнер. «Я ведаю прыклады, калі вялікія спартсмены станавіліся вялікімі трэнерамі, і наадварот. Я б тут не быў катэгарычны, усё залежыць ад жадання вучыцца. Ёсць жа схільнасць да канкрэтнага віду спорту, і паступаючы ва ўніверсітэт, таксама гэтым кіруюцца. Гэта як любоў да сям'і, да блізкіх людзей. Тое ж і з прафесіяй, у тым ліку і з трэнерскай», — падкрэслівае Сяргей Рэпкін.

З-за нестабільнага графіка спартсменаў, іх пастаянных раз'ездаў па зборах і спаборніцтвах, у БДУФК ёсць асаблівасць, якая вылучае яго сярод іншых універсітэтаў, — індывідуальны вучэбны план, што дазваляе ўзгадніць навучанне ва ўніверсітэце са спартыўнай кар'ерай. Спецыяльна для гэтага распрацаваны дыстанцыйныя электронныя курсы, электронныя вучэбна-метадычныя комплексы па кожнай вучэбнай дысцыпліне, дзе сабраны ўвесь тэарэтычны матэрыял і заданні для выканання. «Мы доўга думалі, як у дыстанцыйнай форме прадставіць студэнтам практычны матэрыял. І вырашэнне гэтай праблемы мы лічым сваім ноу-хау, хоць яно і вельмі простае, як усё геніяльнае. Мы распрацавалі рабочы сшытак, дзе ў электроннай форме прадстаўлены практычныя заданні. Гэтую сістэму ўдасканальваем, і ў поўнай ступені яна пачне працаваць у 2022/2023 навучальным годзе. Кульмінацыяй будзе палажэнне аб дыстанцыйных вучэбных курсах», — расказвае Алена Фільгіна. Прарэктар адзначае, што такая сістэма стала сапраўдным выратаваннем, калі пачалася пандэмія каранавіруса і ўніверсітэт перайшоў на дыстанцыйную работу.

«Падчас прыёмнай кампаніі ў нас у кожным корпусе працавалі тэлевізары. Калі выступаў Ваня Літвіновіч, мы на пяць хвілін пазней пачалі прыём уступных іспытаў, бо ўсе чакалі выніку».

Аднак вучыцца па індывідуальным плане могуць толькі найлепшыя, члены нацыянальных і зборных камандаў. Гэта патрабаванне рэктара Сяргея Рэпкіна. Тыя, хто на індывідуальным плане, павінны наведаць не менш за 30 % заняткаў, для астатніх галоўнае патрабаванне — вучыцца. На першы погляд можа здацца, што спартыўны ўніверсітэт робіць пэўныя патураннi і паслабленні для студэнтаў-спартсменаў. Але прарэктар па вучэбнай рабоце рашуча тое абвяргае: «Ёсць універсітэты, якія ідуць насустрач спартсменам, у нас наадварот. Мы змагаемся за якасць падрыхтоўкі, і, як паказвае вопыт, такія меры даюць вынікі. Больш студэнтаў з рэгіянальных універсітэтаў хоча перавесціся да нас. Прыязджае больш абітурыентаў з-за мяжы. Якасць падрыхтоўкі кадраў — вышэйшая за ўсё. І гэта невыпадкова. БДУФК — адзіны профільны ўніверсітэт у краіне. У нас працуюць высокакваліфікаваныя спецыялісты, у мінулым трэнеры і спартсмены». Праўда, дзеючых трэнераў сярод выкладчыкаў БДУФК няшмат. Прычына — вялікая занятасць і нестабільны графік. Але трэнеры-практыкі актыўна ўдзельнічаюць у навуковых канферэнцыях, дзеляцца вопытам з універсітэцкімі калегамі, праводзяць майстар-класы.

СПЕЦЫЯЛІСТЫ РАСТУЦЬ У ШКОЛЕ...

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры пачынае рыхтаваць трэнераў яшчэ са школы. Як расказаў рэктар Сяргей Рэпкін, два гады таму па ініцыятыве ўніверсітэта ў беларускіх школах былі адкрытыя профільныя класы спартыўна-педагагічнай накіраванасці. Іх мэта — зацікавіць школьнікаў спартыўнай, у прыватнасці, трэнерскай дзейнасцю, і матываваць паступаць у БДУФК. «Мы хацелі, каб да нас паступалі абітурыенты з высокім балам, зацікаўленыя ў трэнерскай рабоце. І сумуюі, якія мы праводзілі з выпускнікамі такіх класаў сёлета, паказалі, што сваіх мэт мы дасягнулі», — падкрэслівае Сяргей Барысавіч.

Сёння будучыя трэнеры вучацца ў 11 беларускіх школах. У профільныя класы спартыўна-педагагічнай накіраванасці школьнікі пераходзяць пасля дзявятага класа. Для гэтага іх агульны бал атэстата павінен быць не меншы за «шэсць», з адзнакай не ніжэй «сямёркі» па профільных прадметах — біялогіі і рускай ці беларускай мовах. Пры выпуску са школы бал па ўсіх вучэбных прадметах павінен быць не ніжэйшы за «сем», з адзнакамі за профільныя прадметы — не ніжэй за «восем». Акрамя таго, вучні павінны ўдзельнічаць у спартыўных мерапрыемствах і прайсці факультатыўныя заняткі «ўводзіны ў спартыўна-педагагічныя спецыяльнасці». Выкананне гэтых патрабаванняў дае выпускнікам магчымасць без экзаменаў паступаць у ВНУ, дзе ёсць дзве спецыяльнасці — «фізічная культура (па напрамках)» і «спартыўна-педагагічная дзейнасць». Трэба толькі прайсці сумоўе.

Вучэбную праграму для профільных класаў распрацавалі таксама спецыялісты БДУФК. Яна ўключае ў сябе чатыры модулі: гісторыя фізічнай культуры і спорту, анатама-фізіялагічныя асаблівасці мышачнай дзейнасці, псіхолага-педагагічныя асаблівасці спартыўнай падрыхтоўкі, тэорыя і методыка фізічнага выхавання і спорту. Універсітэтам быў распрацаваны і вучэбна-метадычны комплекс для школьных настаўнікаў фізічнай культуры.

Адкрыццю профільных класаў спартыўна-педагагічнай накіраванасці папярэднічала вялікая работа ўніверсітэта і школ. Першым крокам стала арганізацыя рэспубліканскай алімпіяды па вучэбным прадмеце «фізічная культура». «Мы заўсёды казалі, што фізічная культура ў школе павінна быць раўнапраўным прадметам. І разам з Рэспубліканскім цэнтрам фізічнага выхавання навучэнцаў і студэнтаў мы распрацавалі заданні алімпіяды. Школьнікі любяць гуляць, таму ў алімпіяду ўвайшлі валейбол, баскетбол, гандбол і футбол. Наша кафедра гульнявых відаў спорту распрацавала праграму. І першы плод не пайшоў за плот», — расказвае Алена Фільгіна.

Чэмпіёны свету і Еўропы, якія перамаглі ў год паступлення, могуць паступіць ва ўніверсітэт без уступных іспытаў. Але не факт, што з выдатнага спартсмена атрымаецца вялікі трэнер.

...І Ў ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЕ

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры дапамагае развівацца не толькі тым, хто яшчэ толькі плануе звязаць сваё жыццё з трэнерскай дзейнасцю, але і ўжо вопытным трэнерам. Спецыяльна для гэтага працуе Вышэйшая школа трэнераў. Яе асноўная функцыя — павышэнне кваліфікацыі трэнерскага саставу Рэспублікі Беларусь, у першую чаргу тых, хто можа працаваць з нацыянальнымі і зборнымі камандамі. У спорце не бывае дробязяў і на кожным этапе павінны быць дасведчаныя людзі. БДУФК дае магчымасць развівацца кожнаму — ад школьніка, які марыць стаць трэнерам, да кваліфікаванага спецыяліста.

І як прынята ў спорце, спыняцца на дасягнутым універсітэт не збіраецца. Як расказаў Сяргей Рэпкін, у новы навучальны год БДУФК уступіць з сямю новымі адкрытымі пляцоўкамі — па дзве для валейбола, баскетбола, тэніса і адна для мініфутбола. Па словах рэктара, гэта дазволіць больш якасна праводзіць заняткі і спаборніцтвы. Праз рэканструкцыю пройдзе спартыўнае ядро ВНУ — футбольнае поле і лёгкаатлетычныя дарожкі. Плануецца, што на працягу трох гадоў будзе ўведзены ў эксплуатацыю новы інтэрнат на 700 месцаў. «Улічваючы, што ўніверсітэт рыхтуе спецыялістаў на ўсю краіну, у нас шмат іншагародніх студэнтаў, патрэба ў інтэрнаце ў нас вельмі вялікая. Традыцыйна мы развіваем экспарт паслуг, да нас прыязджаюць замежныя студэнты. У нас ёсць сумесны факультэт з Узбекскім дзяржаўным універсітэтам фізічнай культуры. Развіваецца супрацоўніцтва з іранскімі абітурыентамі, у нас вучыцца каля 100 кітайскіх студэнтаў. Налета плануем адкрыць англамоўную магістратуру. Мы маем унікальную базу, БДУФК — адзін з найлепшых у Еўропе спартыўных універсітэтаў, таму мэты і задачы ў нас адпаведныя, грандыёзныя», — канстатаваў Сяргей Рэпкін.

Валерыя СЦЯЦКО.

Сямейная газета

Выпуск № 15 (174)

ВЯСЕЛЛЕ З ПРЫСМАКАМ НАСТАЛЬГІІ

У мінулую суботу адбылася падзея, якую ў маёй сям'і чакалі паўгода. Акурат на Макавей, як называюць у народзе Мядовы Спас, мая сяброўка Даша выйшла замуж. Нягледзячы на тое што ў бацькоў нас двое — я і старэйшы брат, адчуванне было менавіта такое, што аддаю замуж родную сястру.

З Дашай мы нарадзіліся ў адзін месяц, толькі з розніцай у год. З'явіліся на свет у адной вёсцы, жылі ў адным доме, хоць і на розных паверхах, хадзілі ў адзін дзіцячы садок. Дагэтуль памятаю, як, узяўшыся за рукі, ехалі цёмнымі зімовымі раніцамі на санках — менавіта так у заснежанае надвор'е ў вёсках дастаўляюць у дашкольныя ўстановы дзяцей бацькі. Везлі нас чамусьці таты: ім, сябрам, па дарозе на работу заўжды было аб чым пагаварыць.

У садку працавала Дашына мама. Яе, таленавітага музыку, любілі ўсе ў нашай вёсцы. Не выключэннем былі і мы, дзеці. Галіна Генрыхаўна вучыла нас «патрапляць» у ноты, запамінаць звычайныя дзіцячыя матывы, знаёміла з музычнымі інструментамі. А яшчэ яна вучыла нас плаваць: уявіце сабе, у нашым вясковым садку быў самы сапраўдны басейн! Успамінаюцца святочныя ранішнікі, іншыя мерапрыемствы, якія яна ўмела арганізаваць, у тым ліку і на гэтай вадзе.

З яе дачкой мы разам скончылі дзіцячы садок і, удосталь нагуляўшыся на канікулах перад школай, узяліся за ручкі ды пайшлі ў першы клас. І як селі за адну парту, так і прасядзелі разам да 11 класа. У вучобе Даша была слабейшая за мяне, выдатніцу. Я заўжды імкнулася ёй дапамагчы, хоць іншым чамусьці вельмі не любіла даваць спісваць. Дапамагала сяброўцы рабіць урокі дома, вучыла асвойваць камп'ютар, які ў мяне з'явіўся раней. Яна ж, у сваю чаргу, выручала мяне на гуртках па культурнай самадзейнасці, на ўроках малявання і музыкі — за творчасць у нашым тандэме адказвала Даша.

Мы заўжды былі разам і пасля ўрокаў, на выхадных, падчас канікулаў. Помню, што я заўсёды адмаўлялася ехаць у дзіцячыя летнікі (тады — піянерскія лагеры), бо баялася, што без маёй сяброўкі мне будзе сумна. Мы разам хадзілі ў грыбы і ягады, па чарзе — то ў яе, то ў мяне — палолі на агародах грады, пяклі адна ў адной пірагі і пячэнне... Нашы бацькі заўжды ведалі, што калі дачкі няма дома, значыць, яна з сяброўкай. Помню, як у адзін з першых дзён новага года мы так загуляліся на пляцоўцы каля школы, што мая мама пайшла нас шукаць: быў моцны мароз, снегапад. Нам жа было цёпла: з сяброўкай мы будавалі са снегу дом. Не забуду, калі аднойчы я ўпала з веласіпеда і моцна параніла нагу, а мая Даша «лячыла» маю рану трыпутнікам. Ці як Даша падгаварыла мяне сапсаваць адзін з падарункаў нашага суседа на мой дзень нараджэння — майку. Я размалявала яе чорным фламастарам. А Дашын ручнік, які яна мне ў той дзень падарыла, вісіць і дагэтуль у маёй мінскай кватэры. Не забываюцца і першыя танцы, куды мы ішлі ў непрыгожых ботах (іншых не было), а таму пакідалі іх пад елкай каля клуба і пераабуваліся ў туфлі на абцасах.

А потым моцна захварэла Дашына мама. І на дыскатэкі я ўжо хадзіла без маёй сяброўкі. Мая Даша раптам не па гадах стала сталейшай за мяне. Пакуль цёця Галя ляжала ў бальніцах, яна рабіла ўсю хатнюю справу, палола ў агародзе, дапамагала бацьку з гаспадаркай, а часта, здаралася, глядзела і самога бацьку, які пачаў выпіваць. Галіна Генрыхаўна памерла, калі Дашы было 16 гадоў. Цвярозым дзядзьку Жэню мы сталі бачыць усё радзей. Клопату ў Дашы пабольшала, а тым часам яна заканчвала 11 клас — трэба было думаць выключна пра вучобу, а ёй, беднай дзяўчынцы, часта было не да гэтага. Чым магла, дапамагала сястра, якая жыла ў Мінску, сваякі сталі прыязджаць усё радзей. Мы бачылі гэта, і спрабавалі быць ёй карыснымі. Мая мама часта запрашала Дашу на абеды, нярэдка я прыходзіла да яе начаваць, як магла, дапамагала з вучобай.

Разам і паехалі ў Мінск. Я паступіла на журфак. Даша скончыла курсы цырульнікаў. Усё радзей яна стала прыязджаць у вёску. Па-першае, у выхадныя імкнулася падпрацоўваць, бо трэба было на нешта жыць. Па-другое, прыязджаць у паўпустую хату было для яе вельмі балюча. Раптоўна пайшоў з жыцця і яе бацька. Дзядзькі Жэні не стала — амаль не з'яўлялася ў вёсцы і Даша. Зрэдку прыязджала ў сваю кватэру, але для яе гэта было моцным выпрабаваннем, таму сяброўка заўжды заставалася нанач у маіх бацькоў.

Нягледзячы на ўсе цяжкасці, якія выпалі на Дашын лёс, яна не зламалася. Былі перыяды, калі дзяўчыне не было дзе жыць, калі не хапала грошай на элементарныя рэчы. Аднак, як кажуць, свет не без добрых людзей — заўсёды былі побач тыя, хто ёй дапамагаў. Хапіла ёй і яе мэтанакіраванасці, стойкасці, цярплівасці, дзякуючы чаму яна стала добрым спецыялістам, прафесіяналам у сваёй справе. Сёння Даша — кваліфікаваны цырульнік, майстар самага высокага разраду. Каб трапіць да яе ў салон прыгажосці, людзі запісваюцца за месяц, а тое і больш, наперад. Нарэшце, пашанцавала ёй і ў асабістым жыцці. Вяселле было цудоўнае. Для мяне — са слязьмі на вачах, бо, упэўнена, яе бацькі ганарыліся б сваёй дачушкай.

Вераніка КАНЮТА.

Тыя, хто побач

Алена АТРАШКЕВІЧ:

«МУЖ НЕ ЧАКАЕ, ШТО Я БУДУ ІДЭАЛЬНАЙ ГАСПАДЫНЯЙ ДОМА»

Кампазітар, педагог і першая жанчына-старшыня Саюза кампазітараў Беларусі Алена Атрашкевіч — абаяльная і самадастаткавая. Вакол яе заўсёды шмат людзей — вучні, калегі: яна прыцягвае іх, нібы магніт.

Алена АТРАШКЕВІЧ з мужам Мікалаем.

Калі мы сустрэліся, то пасмяяліся: у нас аказаліся аднолькавыя маскі. На жаль, ад тэмы ковіду сёння нікуды не падзецца. Алена Віктараўна сказала, што яе 89-гадовая маці прайшла курс вакцынацыі. «Мая вялікая радасць», называе яна сваю маму. У голасе столькі цяпла, захаплення, падзякі...

— Мая мама, Ганна Лявонцеўна, — чалавек неверагоднага лёсу. У 13 гадоў, у 1944 годзе, яна засталася круглай сіратой, — распавядае Алена Віктараўна. — Пры гэтым яна — адна з нешматлікіх дзяцей са сваёй вёскі, хто пазней закончыў 10 класаў. Старшыня калгаса даў ёй грошай на дарогу і сказаў: «Табе трэба далей вучыцца, едзь паступаць у Ленінград». І мама паехала. Можна ўявіць, якое ў яе было жыццё: і голад, і холад, і беднасць. Але ўспамінаючы той час, яна ніколі не скардзілася, маўляў, было цяжка. Яна казала пра тое, як заўсёды імкнулася да ведаў, як ёй было цікава працаваць, ставіць перад сабой мэты і дасягаць іх. Мае бацькі стараліся, каб у мяне і маёй старэйшай сястры Наташы было ўсё: дзіцячыя забавы, прыгожае адзенне. Убачыўшы ў сяброўкі піяніна, я таксама сказала бацькам, што хачу займацца музыкай, потым з'явілася цікавасць да малявання. І піяніна, і самыя лепшыя фарбы — усё гэта ў мяне было. У той жа час нельга сказаць, што мы былі распешчаныя. Улетку з сястрой спачатку дапамагалі сваякам па гаспадарцы, потым ужо і працавалі на канікулах. Бацькі ўмелі знайсці нейкую залатую сярэдзіну ў выхаванні. Яшчэ мне вельмі падабалася, што нас ніколі не лаялі за розныя выбрыкі, а спакойна размаўлялі, разбіраліся, да чаго тое можа прывесці.

(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)

Я — школьнік

ВЕДЫ — ПЛЮС, ПЕРАГРУЗКА — МІНУС

Сакрэты паспяховай адаптацыі першакласніка

Хутка надыдзе той чароўны дзень, калі самы старэйшы дашкольнік стане самым малодшым школьнікам — першакласнікам. Для новаспечанага вучня і для яго бацькоў гэта не толькі хвалюючая падзея, але і прыкмета будучых выпрабаванняў. У школе першакласніка падсцерагаюць дакладны распарадак і строгая дысцыпліна. Ад дзіцяці чакаюць хуткага пераходу ад гульнявой да вучэбнай, пазнавальнай дзейнасці. Вакол малога з'яўляецца шмат новых людзей, як сярод дарослых, так і сярод дзяцей, з якімі неабходна ўсталёўваць сувязі. Да такіх перамен першакласніку прывыкнуць няпроста, таму на дапамогу лепш прыйсці дарослым. Пра тое, як гэта зрабіць і на што звярнуць увагу, бацькам расказала псіхолаг Мінскага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей Вольга ВАРАНЬКО.

Шукаць настаўніка, а не школу

— Бацькі звычайна разумеюць і ведаюць, як іх дзіця ўзаемадзейнічае з іншымі малымі, як рэагуе на крытыку дарослага, абзыванні дзяцей, як яно пачынае зносіны, ці ідзе першае на кантакт, — тлумачыць спецыяліст. — Таму пры ўладкаванні свайго малога ў школу трэба больш звяртаць увагу не на прэстыж установы, а на рэпутацыю настаўніка. Справа ў тым, што менавіта настаўнік вызначае мікраклімат у класе. У пачатковай школе першы настаўнік — арыенцір. На жаль, і сёння можна даведацца пра тое, што педагог вылучае якіх-небудзь вучняў, напрыклад, па добрай паспяховасці, ці, наадварот, адасабляе дзяцей за «дрэнныя паводзіны». Такія рэчы вызначаюць міжасабовыя зносіны ў класе.

Калі ж настаўнік знойдзены, бацькі могуць сустрэцца з ім загадзя і расказаць пра асаблівасці наладжвання кантакту са сваім дзіцем. Калі ж не атрымалася, хваляванцца не трэба: у першым класе праз некалькі месяцаў псіхолагам школы праводзіцца дыягностыка адаптацыі. Адным з крытэрыяў з'яўляецца дабрабыт, камфортнасць знаходжання ў класным калектыве. Гэта не закрытая інфармацыя, таму бацькі могуць пацікавіцца вынікамі і, калі патрэбна, своечасова зрэагаваць на праблему.

(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)

Дапамога

КАРЫСНЫ ТЫДЗЕНЬ

Дзённы цэнтр Чырвонага Крыжа ў Гродне для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі арганізаваў VIII інтэграцыйны лагер для сем'яў, якія выхоўваюць дзяцей з інваліднасцю. У лагеры дзеці могуць знайсці новых сяброў, а іх бацькі — адпачыць ад паўсядзённых бытавых праблем.

Лагер працуе з 15 да 21 жніўня ў аграсядзібе «Каралінскі фальварак Тызенгаўза», размешчанай у маляўнічым месцы за некалькі кіламетраў ад абласнога цэнтра.

— Да ўдзелу мы запрасілі актыўных бацькоў з асаблівымі дзецьмі з ліку сем'яў, якія найбольш маюць патрэбу ў падтрымцы, — патлумачыла **кіраўнік Цэнтра для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі Гродзенскай гарадской арганізацыі БТЧК Інеса ЛАРЫЁНАВА.**

Кожны дзень у лагеры распісаны па гадзінах. Пачынаецца ён з зарадкі і заканчваецца дыскатэкай. На працягу тыдня праходзяць розныя трэнінгі, у тым ліку па навучанні першай дапамозе і здароваму ладу жыцця, псіхасацыяльнай падтрымцы, абілітацыі, а таксама майстар-класы, квэсты, заняткі ёгай, гульні на свежым паветры, творчыя конкурсы і іншае.

Валанцёры Чырвонага Крыжа праводзяць для ўдзельнікаў лагера ўводны навучальны курс гісторыі руху. Магчыма, хтосьці з удзельнікаў захоча далучыцца і дапамагаць іншым па прынцыпе «роўны — роўнаму», а валанцёры і супрацоўнікі Чырвонага Крыжа падчас змены будуць дапамагаць бацькам у доглядзе дзяцей.

Знаходжанне дарослых і дзяцей на адпачынку праходзіць з захаваннем санітарна-супрацьэпідэмічных мерапрыемстваў. Дзякуючы падтрымцы Галоўнага ўпраўлення аховы здароўя Гродзенскага аблвыканкама арганізавана правядзенне экспрэс-тэсціравання на каранавірусную інфекцыю ўсіх удзельнікаў лагера.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Сямейны капітал

ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ДАКАЗАНА

Для шматдзетных сем'яў адкрыта ўжо больш за 100 тысяч дэпазітных рахункаў «Сямейны капітал», паведамілі ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны. Так, на 1 жніўня 2021 года адкрыта ўжо 102 250 дэпазітных рахункаў.

Па праграме «Сямейны капітал» 2015—2019 гадоў для шматдзетных сем'яў адкрыта 82 427 дэпазітных рахункаў на суму 824,3 мільёна долараў.

Памер прызначанай у мінулую пяцігодку сумы складаў 10 тысяч долараў у эквіваленце для шматдзетных сем'яў, у якіх трэцяе або наступнае дзіця нарадзілася (усыноўлена, удачарона) у перыяд з 1 студзеня 2015 года да 31 снежня 2019 года ўключна. Звярнуцца па прызначэнне сямейнага капіталу можна было да 30 чэрвеня 2020 года ўключна — не пазней за шэсць месяцаў з дня нараджэння (усынаўлення, удачарэння) трэцяга дзіцяці або наступных дзяцей.

Па праграме 2020—2024 гадоў для шматдзетных сем'яў адкрыта 19 823 дэпазітныя рахункі на суму Br452,5 мільёна. У новай пяцігодцы сямейны капітал прызначаецца шматдзетным сем'ям, у якіх трэцяе або наступнае дзіця нарадзілася (усыноўлена, удачарона) з 1 студзеня 2020 года да 31 снежня 2024 года ўключна. У 2020 годзе памер сямейнага капіталу складаў Br22,5 тысячы, а з 1 студзеня 2021 года павысіўся да Br23 737,5.

Вядома, што сродкамі сямейнага капіталу можна распарадзіцца датэрмінова. На 1 жніўня гэтага года на датэрміновае распараджэнне сродкамі пададзена 40 189 заяў. З іх на паляпшэнне жыллёвых умоў — 35 842 (89 %), на атрыманне адукацыі — 1811 (5 %), на атрыманне медыцынскіх паслуг — 2536 (6 %). Прынята 38 067 рашэнняў аб датэрміновым распараджэнні сродкамі сямейнага капіталу.

Дарэчы, вынікі першай пяцігадовай праграмы сямейнага капіталу даказалі яе эфектыўнасць. Тэмп росту колькасці дзяцей, народжаных трэцімі і наступнымі за перыяд праграмы, склаў 140 працэнтаў у параўнанні з перыядам 2010—2014 гадоў.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

Ёсць пытанне

ДАБРЫНЯ СУПРАЦЬ БУЛІНГУ

У беларускіх школах будуюць сяброўскае асяроддзе

Праект, скіраваны на змяншэнне ў школах колькасці канфліктаў сярод вучняў і прадухіленне сітуацыі булінгу і фізічнага і псіхалагічнага ціску, працуе ўжо год. Апрабаваная ў Харватыі, Сербіі, Чарнагорыі і Балгарыі мадэль дапамагла напалову зменшыць узровень гвалту ва ўстановах гэтых краін, а булінг — на тры чвэрці. Пра вынікі ўкаранення ў Беларусі харвацкай мадэлі, якую ў межах эксперымента на працягу пяці гадоў рэалізоўваюць у 26 школах краіны Дзіцячы фонд ААН (ЮНІСЕФ) і Міністэрства адукацыі, расказалі эксперты.

Камфортны клімат для ўсіх

Мэта праекта па стварэнні мадэлі «Сяброўскае і падтрымліваючае асяроддзе ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі», які будзе ўкараняцца ў айчынных школах да 2025 года, — зрабіць псіхалагічныя ўмовы для навучання школьнікаў як мага больш спрыяльнымі. Прынамсі, вялікую працу па адаптацыі мадэлі правялі спецыялісты Інстытута псіхалогіі БДПУ і Рэспубліканскага цэнтра псіхалагічнай дапамогі БДПУ, заўважыў **Аляксандр ЖУК, рэктар БДПУ:**

— Распрацаваны дапаможнік для педработнікаў школ. Па праграме «Бяспечнае і падтрымліваючае асяроддзе ў школах» абучаны ментары і спецыялісты сацыяльна-псіхалагічных службаў, а сама яна пратэсціравана ў пяці школах. Беларуская версія праграмы прэзентавана для дзяржаўных устаноў адукацыі — для магчымага ўключэння асобных модуляў у праграмы падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі педработнікаў.

Вынікі праекта арганізатары бачаць у фарміраванні ўзаемнай павагі ў вучняў, устаноўцы сістэмы правіл і маніторынгу іх выканання. Чакаецца, што ў працэс прафілактыкі гвалту сярод аднагодкаў уключацца бацькі, настаўнікі і мясцовыя ўлады. Мяркуецца таксама, што ва ўстановах адукацыі будзе створаны камфортны клімат для ўсіх. Праект важны таксама для аднаўлення педагагічнай адукацыі ў краіне ў галіне ўстойлівага развіцця да 2030 года, упэўнены рэктар:

— Місія ўніверсітэтаў — падрыхтаваць педагогаў, якія змогуць выхаваць моладзь з гуманістычным светапоглядам, крытычным, сацыяльна і экалагічна арыентаваным мысленнем і актыўнай грамадскай пазіцыяй. Рэалізацыя патрабуюць стварэння сяброўскіх дзіцяча-дарослых супольнасцяў як галоўнага механізму фарміравання новых сацыяльных практык у адукацыйнай прасторы.

Падчас другога года дзеяння праграмы, якая распачата ў 2000-м, мяркуецца замацаваць напрацаваныя вынікі, а на трэці — далучыць да эксперымента новыя школы, падкрэслівае **Алена ГАЛАЎНЁВА, намеснік начальніка ўпраўлення сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі:**

— Міністэрства мае на мэце стварэнне бяспечнага і сяброўскага асяроддзя ў школе для кожнага дзіцяці, незалежна ад асаблівасцяў яго псіхафізічнага развіцця і ўзроўню ведаў. Будзе ўдасканальвацца работа з ментарамі і павялічваца іх колькасць. Мэтазгодна, пэўна, унутры кожнай установы гадаваць свайго ментара, незалежна ад яго пасады. Галоўнае, каб да яго са сваёй праблемай мог падысці кожны навучэнец.

Амбіцыйныя планы

Напачатку былі амбіцыйныя планы пачаць рэалізацыю праекта адразу ў сотні беларускіх школ у першы ж год, аднак немагчыма было знайсці столькі валанцёраў для работы, заўважыла **Таня РАДАЧАЙ, прадстаўнік ЮНІСЕФ у Беларусі.** Акрамя таго, многія проста не верылі, што булінг — сур'ёзная праблема, ці папросту закрывалі на гэта вочы. Аднак знайшліся школьнікі, якіх вельмі зацікавіла гэтая праблема, і якія з ёй сутыкаліся, і якім трэба было дапамагчы справіцца з праявамі стыгматызацыі. Даводзілася працаваць і з бацькамі, дзеці якіх сутыкаліся з булінгам і цкаваннем і якія дапускалі памылкі ў вырашэнні гэтых праблем.

— Важна паўтараць назапашаныя і створаныя практыкі з году ў год, каб дасягнуць станоўчых вынікаў у супрацьдзеянні гвалту з кожным новым пакаленнем вучняў і настаўнікаў.

Яна выказала спадзяванне, што ў Беларусі будзе створана адаптаваная мадэль, якая пасля будзе прымяняцца ў большай колькасці школ.

— Аднак не існуе ідэальных парад для розных сітуацый, таму неабходна рыхтавацца да таго, што заўжды трэба будзе ствараць нешта новае для вырашэння праблем, з якімі будуць сутыкацца дзеці і ў рэальным свеце, і ў анлайн-прасторы. І трэба навучыць дзяцей расказваць пра праблемы, якія з інтэрнэтных пераходзяць у рэальнае асяроддзе, і добра, калі ў школе і дома ёсць людзі, якім яны могуць давяраць. Год, за які рэалізоўваецца праект, ужо паказаў, з якімі праблемамі ў адносінах рэальна сутыкаюцца школьнікі і ментары.

«Дыягностыка» пытання

Сем крокаў харвацкай мадэлі айчынныя спецыялісты перапрацавалі пад беларускія рэаліі. Вельмі важна было вызначыць сэнс ідэі для яе паспяховай рэалізацыі, расказала пра работу над айчыннай мадэллю праекта **Ала МУЗЫЧЭНКА, загадчык кафедры псіхалогіі адукацыі і развіцця асобы Інстытута псіхалогіі БДПУ, кіраўнік праекта.**

Важна было ўсё: і падрыхтоўка рэкламнай прадукцыі для візуалізацыі прасторы ў школах, каб яна не стала проста звыклай выявай, якая не мае сэнсавай нагрузкі, і значкі, якія трансліруюць ідэю таго, што сіла ў дабрыні. Да мерапрыемстваў далучалі і выпускнікоў школ, якія ўжо з пункту гледжання бацькоў выказвалі свае думкі і бачанне праблемы.

— З дапамогай ЮНІСЕФ ментары і валанцёры (старшакласнікі гэтых жа школ) праводзілі адкрытыя ўрокі на тэму супрацьдзеяння булінгу па прынцыпе «роўны навучае роўнага». Правялі конкурс-трэнінг па тэхналогіі АПШЫФТ «Пошук рашэнняў для супрацьдзеяння булінгу ў школьным асяроддзі», дзе кожная школа прапанавала сваё бачанне прымянення інструментаў для вырашэння праблемы, — расказала яна. *— Былі надрукаваны буклеты і распрацаваны метадычныя рэкамендацыі, як іх выкарыстоўваць, якія гульні і дыскусіі арганізаваць, каб перадаць інфармацыю іншым. Пазней праводзілі дыягностыку сітуацый і нават асобных навучэнцаў, якія аказаліся ў праблемным становішчы, каб вызначыць, каму дзіця гатовае давяраць, якія агрэсары ёсць у класе.*

Якога полу агрэсар?

Праваднік ідэй праектаў у кожнай установе, дзе праходзіць эксперымент, — ментар, які, як правіла, не працуе ў школе, таму мае больш нейтральны і кампетэнтны погляд. Аднак ёсць і тыя, хто ведае працэс знутры і з'яўляецца не знешнім, а ўнутраным ментарам. З такіх — **Людміла ЖУКОЎСКАЯ, педагог-псіхолаг сярэдняй школы № 125 г. Мінска:**

— У ініцыятыўнай групе нашай школы восем педагогаў, кожны з якіх склаў індывідуальны план работы ў межах праекта. Трэба было патлумачыць і расказаць усяму калектыву школы пра рэалізацыю праекта. Трэба было прыцягнуць таксама ўсіх класных кіраўнікоў, а яшчэ патлумачыць бацькам, што гэта за праект. А стаўленне апошніх да школы вельмі рознае. Ёсць нават тыя, хто ўпэўнены: менавіта школа — галоўны булер, і праблемы ўзнікаюць менавіта тут, незалежна ад сітуацыі ў сям'і.

На старце праграмы шляхам анкетавання 201 навучэнца (сярод жадаючых) 5—9-х класаў (124 хлопчыкі і 77 дзяўчынак) даследавалі актуальны стан суполкі навучэнцаў школы. Па выніках атрымалася, што ў школе 26 % агрэсараў (большасць хлопчыкі) і 6 % ахвяр.

— Такі паказчык — прыкладна адзін агрэсар на клас, што не так і кепска, аднак паказвае, што прафілактыка булінгу — найлепшая мера. Штомесяц работу абагульнялі. Плюс быў у тым, што я магла звярнуцца ў любы час да бацькоў і настаўнікаў, мінус — у тым, што некаторыя намагаліся перакласці ўсю работу на мяне.

За год правялі шмат трэнінгаў з настаўнікамі, заняткаў па фарміраванні адэкватнай самаацэнкі і развіцці талерантнасці і самапазнання з вучнямі 5—10-х класаў.

Напрыканцы года правялі паўторнае анкетаванне ўжо сярод 402 вучняў: 226 хлопчыкаў і 176 дзяўчынак. Асобна былі адабраныя падлеткі, якія паказалі агрэсіўныя і змешаныя паводзіны ў папярэднім даследаванні (82 чалавекі ва ўзросце ад 11 да 15 гадоў: 21 дзяўчынка, 61 хлопчык). Атрымалася, што агрэсарамі паказалі сябе 57 % дзяўчынак і 58 % хлопчыкаў, так што гендарная прыналежнасць ролі не іграе, падсумавала ментар.

Каб разам справіцца з булінгам, трэба каб школьнікі, настаўнікі і бацькі не толькі разумелі праблему, але і хацелі ад яе пазбавіцца і палепшыць школьнае жыццё.

Ірына СІДАРОК, фота аўтара.

«МУЖ НЕ ЧАКАЕ, ШТО Я БУДУ ІДЭАЛЬНАЙ ГАСПАДЫНЯЙ ДОМА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

Памятаю, калі маме было 77 гадоў, яна паднімалася на пяты паверх у доме без ліфта, і ў яе трохі збілася дыханне. Яна кажа: «А што ж будзе, калі я пастарэю?» Захапляюся яе па-ранейшаму ўчэпістым інжынерным розумам, любоўю да жыцця. Ёй усё цікава, яна вельмі прасунуты чалавек. Упэўненая, што менавіта мама прыклала максімум намаганняў для таго, каб усе мы адбыліся, былі паспяховыя і шчаслівыя.

— Дзе працавалі вашы бацькі?

— Пасля размеркавання мама працавала на цэлюлозна-папяровым камбінаце ў Калінінградзе. Яна ж настаяла, каб тата таксама атрымаў вышэйшую адукацыю. Потым яны пераехалі ў Казахстан, у Кзыл-Арду, там прайшлі першыя шэсць гадоў майго жыцця.

Аляксандр і Кацярына — дзеці Алены Віктараўны.

— Вось як! А чамусьці ўсе лічаць, што вы родам з Маладзечна.

— Нарадзілася я ў Барысаве. Мама спецыяльна прыехала з Кзыл-Арды на радзіму, таму што ў Казахстане ў той час была вялікая дзіцячая смяротнасць. У Маладзечна я трапіла па размеркаванні, пражыла там больш за дванаццаць гадоў, атрымала вядомасць як кампазітар і педагог. Мабыць, таму гэты горад лічаць маёй радзімай. З Казахстана бацькі пераехалі ў Чашнікі і працавалі там на папяровай фабрыцы «Чырвоная зорка»: тата — галоўным інжынерам, мама — намеснікам дырэктара. Тата ўжо пайшоў з жыцця, а мама па-ранейшаму жыве ў Чашніках. Гэта я пералічваю ўсе мясціны, дарагія майму сэрцу. Працягваем спіс: Мінск, Ленінград, маміна радзіма — вёска Астраўкі ў Крупскім раёне. Менавіта там мы праводзім лета, там крыніца майго натхнення: кранальная прыгажосць, цішыня — гэта тое, што трэба кампазітару для творчасці.

— Раскажыце, як дзяўчынка з невялікага гарадка апынулася ў найпрэстыжнейшай сталічнай сярэдняй спецыяльнай музычнай школе пры Белдзяржкансерваторыі, цяперашняй Рэспубліканскай гімназіі-каледжы пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі?

— У Чашнікі з Мінска прыехала спецыяльная камісія адбіраць музыкальна адораных дзяцей. Сказалі, чакайце, выклічам у Мінск на іспыт. Мама потым расказвала, што ўсе дзеці выходзяць з будынка школы, а мяне ўсё няма і няма. Экзаменавалі досыць сур'ёзна. Памятаю, што ўсе дзеці спявалі «У лесе нарадзілася елачка», а я выканала жартоўную песеньку «Калі мой тата быў вясёлы». Мне было 8 гадоў, калі паступіла ў ССМШ. Першыя чатыры месяцы вучобы яшчэ не было гатовае памяшканне інтэрната. Чацвёра дзяцей пасялілі ў кватэры, а бацькі па чарзе бралі чарговыя адпачынкі, нават за свой кошт, і жылі з намі. Трэба было гатаваць на ўсіх, у школу адвезці. А калі з'явіўся інтэрнат і быт быў наладжаны, мама кожныя выхадныя садзілася за руль першай машыны «Жыгулёў» і прыязджала да мяне. Часам тата з сястрой далучаліся. Дарэчы, практыка пошуку адораных дзяцей у глыбінцы існуе да сёння, і гэта вельмі правільна.

— Кажуць, дзеці-музыканты не бачаць таго самага дзяцінства — увесь час заняткі...

— Займацца мне было ў радасць, цікава. Калі прыязджалі бацькі, мы хадзілі ў паркі, на атракцыёны. Сярод тыдня я знаходзіла час схадзіць у кіно. І яшчэ ў мяне было захапленне: абышла пешшу большую частку Мінска. Гэта зусім не тое, што ехаць у тралейбусе і глядзець у акно. Пешшу можна зазірнуць у кожны двор, разгледзець усе дамы. Увогуле, Мінск у межах 1970—1980 гадоў я ведаю вельмі добра.

— Потым вы з'ехалі вучыцца ў Ленінградскую кансерваторыю, а з мужам калі і дзе пазнаёміліся?

— На апошніх школьных канікулах прыехала да бацькоў, і сяброўка выцягнула мяне на танцы. Я і не вельмі хацела ісці... Аб'явілі белы танец, адзін хлопец падаўся мне сімпатычным... са спіны, яго і запрасіла. Верагодна, лёс...

— І як развівaліся адносіны?

— У асноўным па перапісцы. Тады ж не было інтэрнэту, «Вайбера», пісалі папяровыя лісты. Можна было пагаварыць па тэлефоне. На канікулы прыязджала дадому. Вяселле згулялі, калі я скончыла кансерваторыю.

— Быў шанц застацца ў Ленінградзе?

— Не, у мяне было мэтавае накіраванне, гэта значыць, я павінна была вярнуцца ў Беларусь. Але я марыла пра Мінск, а мне сказалі, што паколькі я з Віцебскай вобласці, то на сталіцу не варта спадзявацца. Прапанавалі Маладзечна. Я з'ездзіла, паглядзела горад і пагадзілася. Працавала там да дэкрэта, а калі нарадзіла дачку, з'ехала да бацькоў. Я раптам зразумела, што ў мяне няма вопыту дамашняга жыцця — з 8 гадоў па інтэрнатах. З энтузіязмам пачала вучыцца гатаваць па кулінарных кнігах, асвоіла макрамэ і вязанне.

— А муж таксама з'ехаў у Чашнікі?

— Не, у гэты час ён вучыўся ў Беларускім аграрным універсітэце. Таму шлюб у нас тады быў, як цяпер кажуць, гасцявы. Мікалай прыязджаў на выхадныя. Сын у нас нарадзіўся праз год і тры месяцы пасля дачкі. Але гэта і нядрэнна, дзеці оптам выраслі *(смяецца)*.

— Яны ладзілі паміж сабой?

— Сябравалі і сябруюць. Але ў маленькіх была і канкурэнцыя. А яшчэ ў іх было такое цікавае ўяўленне гадоў да сямі, што калі ў аднаго дзень нараджэння з падарункамі, то і ў другога таксама. Так і святкавалі дні нараджэння дзяцей — па два разы на год.

— Алена Віктараўна, а дзе вы жылі ў Маладзечне?

— Даволі доўга ў інтэрнаце, быў там сямейны паверх. Адтуль і сябры нашай сям'і. У нас атрымлівалася сябраваць, выручаць, калі трэба з дзіцем пасядзець, чымсьці дапамагчы.

— Маладосць выпала на 1990-я. Як вы іх успамінаеце?

— Гэта цяпер мы думаем: як жа мы жылі, не было таго, іншага... А тады мы ніколі не казалі і, галоўнае, не лічылі, што жывём дрэнна. Было і так, што мы эканомілі на апладе за праезд, ішлі пешшу, але пры гэтым была заначка дзецям на чупа-чупс. Я і сёння ўспамінаю не пра тое, што не было цяперашняга дабрабыту, а, напрыклад, пра тое, што ну вось так атрымалася — з часам купілі мікрааўтобус, у які садзіліся ўсе нашы сябры з дзецьмі, мы выязджалі ў грыбы, проста адпачыць на прыродзе, і гэта было цудоўна!

— Як ваша сям'я, у прыватнасці, дзеці рэагавалі, калі вы працавалі дома?

— Вельмі ўдзячная сваім блізкім, што яны з разуменнем ставіліся да таго, што дома я рыхтавалася да заняткаў, пісала музыку. Дзеці ні разу не тупнулі нагой, маўляў, ім зараз жа нешта ад мяне патрэбна. Муж не чакаў, што я буду ідэальнай гаспадыняй дома, ён разумеў, што для мяне больш важна адбыцца ў творчасці. Дарэчы, пасля дэкрэта я закінула вязанне, макрамэ. Мне проста шкада марнаваць на гэта час. Хоць блізкія кажуць, што ў мяне добра атрымлівалася. Мікалай заўсёды разумеў, што калі я фізічна знаходжуся дома, не факт, што быў час прыгатаваць вячэру. Ён сам выдатна прыгатуе і ўсіх накорміць. Гэтаксама з усялякімі дамашнімі справамі — робіць той, у каго ёсць магчымасць.

Мой муж па сваім характары дамасед. І я ніколі не тое што не патрабую, нават не прашу, каб ён мяне суправаджаў на нейкія мерапрыемствы. Але на мае канцэрты ён ходзіць, як і ўсе мае блізкія. І я рада, што гэта ім шчыра цікава.

— Чым займаюцца вашы дзеці?

— Сын Саша пайшоў па маіх слядах, ён музыкант, іграе ў аркестры Вялікага тэатра Беларусі. Дачка Каця працягвае справу бабулі, дзядулі і сваёй цёткі — яна працуе ў сферы паліграфіі.

Алена АТРАШКЕВІЧ.

— Ваша сястра Наталля Віктараўна Чорная — доктар тэхнічных навук, прафесар. Вам лёгка знаходзіць агульную мову?

— Мы вельмі сябруем. Наташай захапляюся! Яна ў 23 гады абараніла кандыдацкую дысертацыю. Гэта цяпер падобным нікога не здзівіш, а ў савецкі час лічылася, што навуковую ступень трэба атрымліваць ледзь не бліжэй да пенсіі.

— Хто ў сям'і галоўны па фінансах?

— Галоўнага няма. Я нават не магу сказаць дакладна, колькі зарабляе муж. У мяне стабільная выкладчыцкая зарплата, прафесія кампазітара прыносіць даход, калі ёсць заказы — музыка для кіно, спектакляў. Песні я звычайна дару выканаўцам.

Мы не складваем грошы ў шкатулку, не вылучаем з заробкаў нейкія сумы на вядзенне гаспадаркі. Абмяркоўваем буйныя пакупкі — ці можам сабе іх дазволіць. Ведаю, што калі б, напрыклад, вырашыла купіць аўтамабіль, муж бы ў гэтым паўдзельнічаў, але, мяркую, хопіць і адной машыны для сям'і. Мабыць, у нас ёсць правіла, якое датычыцца грошай: выдаткоўваць іх трэба з задавальненнем, не шкадаваць ні для сябе, ні для сваіх блізкіх і сяброў.

— Ведаю, што вы прымаеце віншаванні: у сям'і вашага сына здарылася папаўненне — нарадзіўся сын Арцемій.

— Гэта вельмі радасная падзея. Але я пакуль усведамляю ролю бабулі ў тым сэнсе, як у нас гэта часцей за ўсё прынята. Лічу, што бабуля — гэта не ўзрост і нават не статус, а стан душы. Калі ўнук падрасце, вырашыць сам, як ён захоча мяне ўспрымаць. Думаю, у нас атрымаецца сябраваць.

— Як ваша сям'я любіць адпачываць?

— Любім падарожнічаць. І шмат дзе ўдалося пабываць, нярэдка сумяшчаючы канцэрты з адпачынкам. Калісьці, ідучы насустрач жаданню дачкі з'ездзіць на адпачынак у Турцыю, паехала туды і пераканалася, што «ўсё ўключана» — гэта не для мяне. Мне падабаецца нешта адкрываць, даследаваць. Не вялікая прыхільніца экскурсій. Горад пазнаеш не тады, калі табе кажуць: паглядзіце направа — паглядзіце налева, а калі ты пройдзеш яго ўласнымі нагамі ў зручным для цябе тэмпе. Самая вялікая мара як вандроўніцы — паглядзець усю Беларусь. Мне аднолькава цікавыя і вядомыя мясціны з адрэстаўрыраванымі палацамі, і якая-небудзь невялікая вёсачка, дзе са славутасцяў — толькі старая царква або руіны замка. Гэтую зацікаўленасць падзяляе ўся сям'я. І тут можна зымправізаваць: з'явіўся свабодны час, выбралі пункт на карце, селі ў машыну і паехалі.

Аксана ЯНОЎСКАЯ.

Як ёсць

Кожны дзясяты шлюб у сталіцы — з іншаземцам

Штогод у Беларусі каля 7 % шлюбаў заключаецца паміж беларусамі і замежнікамі. Аднак сёлета Мінск пабіў гэты рэкорд. Толькі за паўгода сваё каханне з абраннікамі з далёкага замежжа пацвердзіла 9,9 % маладажонаў — а гэта кожная дзясятая зарэгістраваная пара.

Іншаземныя асобы і людзі без грамадзянства ў Беларусі маюць тыя ж правы і абавязкі, як і беларусы, і могуць пабрацца шлюбам у любым загсе краіны, прадставіўшы неабходныя дакументы, расказала **Наталля ЖУКАВА, начальнік упраўлення натарыята і загсаў Мінюста.**

— Шлюб рэгіструецца на адной з дзяржаўных моў краіны: рускай ці беларускай. Калі замежны грамадзянін не валодае ніводнай з іх, ён можа ўзяць з сабой перакладчыка. Пра гэта робіцца адзнака ў актавым запісе.

Увогуле ж у Беларусі штогод заключаецца каля 300 тысяч шлюбаў. А з 1999-га ў краіне дазволена афармляць шлюбныя дагаворы, якія можна заключыць да шлюбу, падчас яго і нават перад разводам. Колькасць такіх дакументаў складае некалькі тысяч штогод і з кожным годам павялічваецца прыкладна на 10 % (за першае паўгоддзе 2021-га зарэгістраваны ўжо 2,2 тысячы шлюбных дагавораў). Спецыялісты звязваюць гэта з ростам прававой свядомасці беларусаў.

Ірына СІДАРОК.

Ірына САЗАНОВІЧ:

«У ПАКУПНІКОЎ НЕ ЎЗНІКАЕ ПЫТАННЯ,

чаму мае лялькі так дорага каштуюць»

Творчасць у жыцці маёй гераіні была заўсёды. Займалася і вышываннем, і маляваннем, нейкі час нарошчвала пазногці і вейкі прыгажуням, рабіла букеты з цукерак. Усё гэта сумяшчала з працай медрэгістратара ў судмедэкспертызе. А калі пайшла ў другі дэкрэт, у інтэрнэце трапіла на ляльку, якая вельмі зацікавіла. «Самаробная, з тканіны. Я ведала, што гэтак змагу. Паспрабавала — атрымалася». З таго часу вось ужо дзесяць гадоў майстрыца-лялечніца Ірына Сазановіч стварае сваіх казачных прыгажунь.

Шыць яна ўмела з дзяцінства, гэтаму навучыла бабуля Ніна, у якой была швейная машынка. Удзячна рукадзельніца і сваёй школьнай настаўніцы працоўнага навучання Вераніцы Іосіфаўне, якая дала пэўны вопыт па швейнай справе. Пасля першай спробы стварэння лялькі адразу з'явіліся кліенты. «Спачатку, — расказвае лялечніца, — кліенткай была сяброўка. З самаацэнкай у мяне ўсё добра *(смяецца)*, таму вырашыла: навошта шыць «у шуфляду». Адну, другую, трэцюю сшыла, па ўсёй кватэры такую колькасць не рассадзіш! Хочацца, каб і людзі бачылі, ацэньвалі».

У хуткім часе лялькі Ірыны Сазановіч з'явіліся на першай аўтарскай выставе. Адтуль адна лялька паляцела ў Парыж. Жанчыне гэта асабліва запомнілася, бо набываў цацку мужчына для сваёй каханай. Напачатку ўмеліца вырабляла ўсё па класічнай схеме, выкрайкі пазычала ў інтэрнэце. А пасля пачала выкарыстоўваць уласныя нарыхтоўкі. «Мне хацелася дадаць нешта сваё: каб лялькі рухаліся, каб гэта была мая ўласная выкрайка, аўтарская», — дзеліцца Ірына.

Хутка майстрыцу ўжо добра ведалі ў Беларусі, а тэкстыльныя лялькі пазнавалі па аўтарскім «почырку» — вялікіх вачах. Да гэтага часу Ірына зразумела, што стаміласяся ад аднастайнасці. На той момант яна аб'ездзіла ўжо вялікую колькасць выстаў, з аўтарскімі прэзентацыямі неаднаразова пабывала за мяжой — на Мальце, у Францыі, Італіі, Расіі, Чарнагорыі... Вырашыла паспрабаваць іншы матэрыял — самазацвердзявальную гліну. Тады ёй здавалася, што гэта вельмі складана. Таму вырашыла спачатку паспрабаваць стварыць свае работы з паліморнай запякальнай гліны. Былі і маленькія зайчыкі, і звяркі розныя, а пасля перайшла да лялькі. Паступова знайшла для сябе два матэрыялы, з якімі працуе і цяпер: японскі La doll і бельгійскі Darwi Classic.

У працэсе работы прыходзіцца цікавіцца многім, звяртацца да інтэрнэту, дзе можна

знайсці нават кніжку па анатоміі, каб навучыцца адчуваць правільныя прапорцыі чалавечага цела і г. д. Ірына тлумачыць, што лялькі не павінны паўтараць правільныя прапорцыі чалавека. «Гэта ж фантазія мастака-аўтара! А калі ляпіць ляльку па чалавечых прапорцыях, яна будзе выглядаць недарэчна. Але калі ты хочаш зрабіць чалавекападобную, тады, вядома, стараешся адпавядаць гэтым правілам», — тлумачыць аўтар.

За дзесяцігадовы творчы лёс заказчыкамі Ірыны былі і славутыя спартсмены, напрыклад, Ала Цупер, Любоў Чаркашына, Марына Ганчарова, і вядомыя беларускія і расійскія артысты і тэлевядучыя Іскуі Абалян, Алеся Ярмоленка, Ірына Ханунік-Рамбальская, Эвеліна Блёданс... Адна лялька-марыянетка была адпраўлена ў падарунак для дочкі Філіпа Кіркорава Алы-Вікторыі. Гэта была лялька з калекцыі «Стары цырк», якую Ірына стварала для Парыжскага лялечнага салона Doll Rendez-Vous in Paris Chow. «Там былі чатыры лялькі: адна паляцела на Мальту, другая — у Вялікабрытанію, трэцяя — да Кіркорава, а чацвёртая засталася ў Парыжы. Зразумела, гэта заўсёды цікава, бо ты не ведаеш, куды цябе прывядзе твая творчасць і з якімі людзьмі пазнаёміць», — гаворыць майстрыца.

«Усе лялькі існуюць у адзіным экзэмпляры, — Ірына распавядае і адначасова дэманструе матэрыял, з якога будзе вылеплівацца будучая прыгажуня. — Лепіш, выгладжваеш, пасля ён высыхае... Усё з нуля. Гэта не фарфоравая адліўка. Матэрыялу такога ў Беларусі няма — прыходзіцца замаўляць. Вочкі шкляныя, гэта з Японіі, валасы я набываю ў Расіі, там шмат, так бы мовіць, неабходных «кос», бо для лялечных валасоў я выкарыстоўваю шэрсць горнай казы. Матэрыял для лепкі — Бельгія, Японія, пастэль (фарба) — таксама Бельгія, то-бок, усё імпартнае, у Беларусі нічога гэтага не вырабляецца».

У сярэднім на выраб адной прыгажуні ідзе месяц. Аднак, па словах Ірыны, гэта гледзячы якая лялька. Над апошняй, «Фенікс», рупліўца працавала два месяцы. Але гэта не значыць, што яна з раніцы да ночы без выхадных сядзіць над лялькамі. «У мяне ёсць сям'я, я займаюся хатняй гаспадаркай, ваджу дзяцей на заняткі, таму працую, адцягваючы ўвагу на іншыя пытанні», — расказала рамесніца.

Ірына робіць нарыхтоўкі загадзя. Пакуль высыхае адна дэталь, стварае наступную — ручкі, ножкі, галоўку... Падрыхтаваныя часткі паскараюць працэс работы над цацкай. Жанчына паказвае матэрыял — мяккі і падатлівы. Ён можа і сам застыць, але, каб сэканоміць час, Ірына выкарыстоўвае стары хатні аэрагрыль.

«А калі раптам нешта не спадабалася ў ляльцы — што рабіць?» — пытаюся ў майстрыцы. Аказваецца, гэта не праблема. Матэрыял тым і шыкоўны, што назаўтра лішак можна зрэзаць і перарабіць неабходнае.

Валасы будучай прыгажуні, як ужо гаварылася, вырабляюцца з шэрсці горнай казы — гэта павінна быць пародзістая жывёла. Жанчына працягвае мне некалькі казіных шкурак з доўгай шэрсцю. Мяккая і сапраўды вельмі падобная да чалавечых валасоў. Ляльчына прычоска трымаецца на клеі — спачатку вычэсваецца, а пасля акуратна, па праборы прымацоўваецца пасмачка да пасмачкі. Фарбуецца ў неабходнае адценне звычайнай фарбай для валасоў. Вядома, гэтыя матэрыялы нятанныя. Таму, гаворыць аўтар, у пакупнікоў не ўзнікае пытання, чаму яе лялькі так дорага каштуюць.

Пяць гадоў таму, калі яна ўпершыню была запрошана ў Парыж на выставу Міжнароднага лялечнага салона Doll Rendez-Vous in Paris Chow і з'яўлялася там адзінай прадстаўніцай ад нашай краіны, зразумела: калі Сусвет табе нешта пасылае, гэта не проста так. «Памятаю, гэта было хвалюючa, да таго ж у Еўропе панаваў вірус Эбола. Аднак я падцягнула сваю французскую і мы разам з мужам паляцелі ў Парыж. Атрымалася нават рамантычная вандроўка. Мора эмоцый, усё цудоўна. Праз год я вазіла яшчэ і сукенкі для дзяцей, у мяне была калекцыя — і лялькі, і сукенкі, аднолькавае адзенне ў лялек і такое ж — у дзетак-мадэляў», — дзеліцца ўспамінамі Ірына.

Увогуле, яна дамасед, лепш за ўсё адчувае сябе ў коле сям'і, а сапраўдную асалоду прыносіць цішыня. Цяпер Ірына свядома адмаўляецца ад удзелу ў кірмашах і мясцовых выставах — проста не бачыць у гэтым сэнсу. Арганізацыя падобных мерапрыемстваў, на жаль, не апраўдвае чаканняў, кірмашы — абсалютна не тое месца для калекцыйных лялек. Замест крамы ў рамесніцы ёсць старонкі ў сацыяльных сетках — Facebook і Instagram, дзе можна паглядзець на працэс стварэння ці забраніраваць упадабаную ляльку. На выставах у замежжы Ірына Сазановіч стараецца заўсёды выстаўляць сваю першую работу — гэта своеасаблівы наказ іншым майстрам, каб людзі бачылі, з чаго ўсё пачалося.

Цікава, а ці шкада аўтару развітвацца са сваімі лялькамі? «Не шкада. У мяне была лялька «Каламбіна» з калекцыі «Стары цырк», якая прасядзела год на камодзе. Я стварала яе для сябе. Аднак ёй пачалі цікавіцца. Думаю, калі людзі так актыўна хочуць яе забраць, навошта адмаўляць. Цяпер «Каламбіна» жыве ў Барысаве», — адзначае рамесніца.

Нягледзячы на тое, што Ірыніны лялькі не такія крохкія, як тыя, што зроблены з фарфору, маленькім дзецям іх лепш не даваць. Затое вырабы могуць цудоўна ўпрыгожыць любы інтэр'ер — майстар падбярэ для лялькі нават сукенку ў тон з колерам будучага пакоя.

Ірына ўдзячна мужу за яго цярплівасць, за тое, што падтрымаў яе лялечнае захапленне ў самым пачатку, ён жа быў і з'яўляецца першым крытыкам: «Ведаю, што муж ганарыцца мной. Дзякуй за яго падтрымку, што трывае гэта ўсё» *(смяецца)*. Увогуле, сям'я для маёй суразмоўніцы — асноўная крыніца натхнення. Яна лічыць: калі ёсць лад у сям'і, тады і ў душы, і ў творчасці ўсё будзе добра. Сваіх дачок 13-гадовую Арышу і 10-гадовую Паліну яна не прымушае да рукадзелля. Мяркуе, што творчасць павінна ісці ад душы. «Паліна малюе і спявае, старэйшая Арыша сама нешта шукае, спрабуе. Калі я толькі пачала займацца ляпнымі лялькамі, навучыла Арыну рабіць кіта, ёй падабаецца. Ужо стварыла для адной сям'і кітоў-маму, тату і дзетак», — усміхаецца майстар.

У мастачкі — вялікая колькасць дыпломаў, і кожная ўзнагарода для яе важная. Яна лічыць, што чалавеку гэта даецца не проста так. «Значыць, — гаворыць лялечніца, — хтосьці збоку рэальна ўбачыў мае старанні, творчасць, мой унёсак у гэтую справу і ацаніў». Адна з самых запамінальных узнагарод для майстрыцы была ўручана ў Італіі падчас прэзентацыі калекцыі «Аліса». Тое, што італьянцы, сапраўдныя знаўцы моды і прыгажосці, прызналі майстэрства невядомага тады аўтара з Беларусі, для Ірыны вельмі каштоўна.

«У нас шмат таленавітых майстроў, і радуе, што людзі не баяцца праяўляць сябе, што ім гэта падабаецца, — гаворыць Ірына. — Я таксама працую ў сваё задавальненне. Хачу жыць у пазітыве і радасці, побач з «маімі» людзьмі. Вельмі рада, што сябе ў гэтым знайшла. Калі б шмат гадоў таму мне хтосьці сказаў, што я буду шыць лялек, пакруціла б пальцам ля скроні. А цяпер разумею, што гэта вельмі крута».

***P. S.** Асобны дзякуй Ірыне за гасціннасць, за смачную каву і за тое, што дазволіла пабываць у яе ўтульным доме і спрычыніцца да цуду стварэння казачнай лялькі!*

Надзея ЗУЕВА.
Фота з архіва гераіні.

ВЕДЫ — ПЛЮС, ПЕРАГРУЗКА — МІНУС

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

— Часта для згуртавання дзіцячага калектыву выкарыстоўваюць так званыя класныя гадзіны, — расказвае спецыяліст. — На іх дзеці разам з настаўнікам разважаюць на тэмы сяброўства, раскрыцця талентаў, інтарэсаў кожнага дзіцяці. Класныя гадзіны звычайна арганізоўваюць настаўнікі ці псіхолагі, але нядрэнна далучацца час ад часу і бацькам.

Лайфхак ад псіхолагаў

У адказ на новыя павышаныя патрабаванні да першакласніка ў першыя тыдні і месяцы навучання могуць з'явіцца скаргі дзяцей на стомленасць, галаўныя болі, малое можа стаць раздражняльнае, плаксівае, пачаць дрэнна спаць. У некаторых зніжаецца апетыт, а разам з тым і маса цела.

Праблемай адаптацыі становяцца і цяжкасці псіхалагічнага характару, такія як, напрыклад, адчуванне страху, негатыўнае стаўленне да вучобы, настаўніка, няправільнае ўяўленне аб сваіх здольнасцях і магчымасцях, агрэсіўнасць.

— Дапамога ў такіх сітуацыях — аднаўленне ў дзіцяці станоўчага стаўлення да жыцця, у тым ліку і да штодзённай школьнай дзейнасці, да ўсіх асоб, якія ўдзельнічаюць у навучальным працэсе (дзіця — бацькі — настаўнікі — калектыў), — гаворыць спецыяліст. — Асабліва нельга ў гэты перыяд параўноўваць дзіця з іншымі: малое можа стаць няўпэўненае, агрэсіўнае ў адносінах да аднакласнікаў.

Ёсць лайфхак ад псіхолагаў у такіх выпадках: параўноўваць дзіця з самімі сабой. Напрыклад, «глядзі, учора табе сказалі нешта крыўднае і ты змог пастаяць за сябе, адказаць, што табе непрыемна, значыць, і сёння атрымаецца».

Усе сілы — на дапамогу

Малое не хоча ісці ў школу, яго паводзіны раптам памяняліся, яно адмаўляецца вучыцца, становіцца замкнёнае, нелюдзімае, устройвае істэрыкі і зрываецца? Гэта першыя прыметы таго, што дзіця крыўдзяць.

— Калі дзіця паведамляе бацькам пра тое, што яно ці яшчэ хтосьці падвяргаецца здзекам, малое неабходна падтрымаць, пахваліць за тое, што яно набралася адвагі і расказала пра гэта,— раіць псіхолаг. — Абавязкова падкрэслівайце розніцу паміж «даносам» з мэтай зрабіць камусьці непрыемнасць і адкрытай размовай з дарослым чалавекам.

Нярэдка бацькі не ведаюць, як рэагаваць, яны не гатовыя дапамагчы. Не выправяць сітуацыю і такія заўвагі, як «ты сам вінаваты», «шукай прычыну ў сабе», «з табой нешта не так», «табе трэба змяніцца» ці «ты занадта або недастаткова разумны, моцны». Парады такога кшталту бессэнсоўныя і нават небяспечныя ў сітуацыі булінгу.

— Важна разумець, што цкаванне — гэта праблемы групы (класа), а не дзіцяці, — тлумачыць псіхолаг. — Малыя маюць патрэбу ў дарослым, і задача бацькоў — сур'ёзна паставіцца да сітуацыі, забяспечыць пачуццё абароненасці і накіраваць усе сілы на дапамогу. Не ператварайце абмеркаванне падрабязнасцяў непрыемных сітуацый у допыт. Супакойце і падтрымайце дзіця, далей вельмі акуратна ўдакладніце асаблівасці сітуацыі, а потым ужо пачынайце абмеркаванне праблемы з настаўнікам і школьным псіхолагам.

У шэсць ці ў сем?

Не кожнае дзіця гатовае вырашаць задачы першакласнікаў: усталяванне кантактаў з аднагодкамі і педагогамі, выкананне патрабаванняў школьнай дысцыпліны, новыя абавязкі. Вопыт паказвае, што дзеці, нават з высокім узроўнем інтэлектуальнага развіцця, з цяжкасцю пераносяць нагрузку, якую стварае школьнае навучанне.

— Для першакласнікаў адаптацыя да школьнага рэжыму можа стаць сапраўдным выпрабаваннем, — лічыць псіхолаг. — Вопыт паказвае, што часцей за ўсё ўзнікаюць праблемы ў дзяцей, якія пайшлі ў школу ў шэсць гадоў. Ім цяжэй падпарадкоўвацца школьнаму рэжыму, засвойваць школьныя нормы паводзін, прызнаваць школьныя абавязкі. Год, які аддзяляе шасцігадовае дзіця ад сямігадовага, вельмі важны для псіхічнага развіцця. З шасці да сямі ў дзіцяці фарміруецца адвольная рэгуляцыя паводзін, арыентацыя на сацыяльныя нормы і патрабаванні. У гэты час фарміруецца новы від псіхічнай дзейнасці: «я — школьнік». Таму каб адаптацыя праходзіла лягчэй, аддаваць дзяцей у школу псіхолагі рэкамендуюць у сем гадоў.

Наталля ТАЛІВІНСКАЯ.

❍ Сакрэты паспяховай адаптацыі

✓ Безумоўнае прыняцце дзіцяці. Не спрабуйце выкараніць у гэты час «заганы», шукайце моцныя бакі.

✓ Старайцеся быць адкрытымі з сынам ці дачкой.

✓ Развівайце ў малым упэўненасць, што яно можа змяніць і кантраляваць сітуацыю, але калі спатрэбіцца, вы заўсёды прыйдзеце на дапамогу.

✓ Дзіця мае патрэбу ў клопаце, абароне, падказках. Дом для яго — месца сілы, крэпасць, дзе яно можа адпачыць, сказаць усё, што думае і адчувае, расслабіцца. Стварайце для гэтага ўсе ўмовы.

Бяспека ў доме

ЛОЖАК, ЦЫГАРЭТА, БЯДА...

У гадзіну дня 17 ліпеня ў службу ратавання 101 паступіла паведамленне аб пажары ў кватэры па вуліцы Гогаля ў Полацку. Ратавальнікі, якія хутка прыбылі, на месцы выкліку выявілі задымленне ў кватэры на другім паверсе. Уваходныя дзверы ў кватэру былі зачынены, таму было прынята рашэнне трапіць туды праз акно. У адным з пакояў на ложку спаў гаспадар, а пад ім тлеў матрац. Мужчыну разбудзілі, вывелі на лесвічную пляцоўку ўжо праз дзверы і перадалі медыцынскім работнікам. Меркаваная прычына пажару — неасцярожнае абыходжанне з агнём пры курэнні гаспадаром дома.

Трывожны званок аб загаранні ў доме паступіў з вёскі Слабада Гарадоцкага раёна 19 ліпеня ў 15 гадзін 29 хвілін. Калі ратавальнікі прыбылі па адрасе, іх сустрэў мужчына, які тэлефанаваў. Ён паведаміў, што ў доме можа знаходзіцца гаспадар. Полымя яшчэ не вырвалася вонкі, аднак ішоў моцны дым. Ратавальнікі тут жа прыступілі да пошуку чалавека. Мужчыну знайшлі ў дальнім пакоі на падлозе, без прытомнасці, побач гарэлі ложак і пасцельная бялізна. Пацярпелага вынеслі на свежае паветра і да прыезду медыкаў спрабавалі прывесці ў прытомнасць, потым даставілі ў бальніцу з атручэннем прадуктамі гарэння і апёкамі. Як стала вядома, гаспадар дома пражываў адзін і нідзе не працаваў. Меркаваная прычына пажару — неасцярожнае абыходжанне з цыгарэтай.

Курэнне вельмі дорага абыходзіцца чалавеку. Узамен на атрыманае задавальненне ад тытуню ён можа пазбавіцца жылля, а часам і жыцця. Усе праблемы людзі ствараюць сабе самі легкадумнымі паводзінамі — выкінуўшы незатушаны недакурак, закурыўшы ў ложку і г. д. Сам недакурак праз некаторы час гасне, але ўтвораны ім ачаг тлення потым разгараецца.

10 жніўня паступіў званок у сталічную службу ратавання аб пажары на 14-м паверсе шматпавярховага жылога дома па вуліцы Платонава. Паводле паведамлення, стала вядома, што ў кватэры могуць знаходзіцца дзеці 13 і 7 гадоў. На момант прыбыцця ратавальнікаў балкон на 14-м паверсе быў ахоплены полымем. Высветлілася, што адбылося ўзгаранне маёмасці на балконе. На шчасце, дзеці пакінулі кватэру да прыбыцця работнікаў МНС, ніхто не пацярпеў, агонь у кватэру не трапіў. Меркаваная прычына пажару — неасцярожнае абыходжанне з агнём нявызначанай асобы. Непатушаны недакурак быў выкінуты з вышэйразмешчанага паверха.

Дастаткова часта да каварнай цыгарэты дадаецца яшчэ і некалькі чарак моцных напояў. У гэтым выпадку кантраляваць сітуацыю становіцца цяжэй: алкаголь і нікацін робяць сваю справу. Ратавальнікі, якія прыбылі на месца, знаходзяць чалавека ў «абдымках» цыгарэтнага дыму і тлеючых пасцельных рэчаў. Пашанцуе, калі з такіх абдымкаў яго атрымаецца выратаваць. Акрамя самога віноўніка пажару, часта пакутуюць і суседзі, асабліва ў шматкватэрных жылых дамах. Нярэдка даводзіцца нават эвакуіраваць усіх жыхароў пад'езда.

8 жніўня ў Наваполацку супрацоўнікі МНС выратавалі мужчыну на пажары. Званок паступіў пасля паўночы. Загаранне адбылося ў кватэры, размешчанай на першым паверсе шматкватэрнага жылога дома. Дзверы ў кватэру былі зачынены знутры, на грукат і просьбы ніхто не рэагаваў. Таму было прынята рашэнне выбіць дзверы. У кватэры было шмат дыму, у пакоі на падлозе ратавальнікі ўбачылі мужчыну — ён быў у прытомнасці, але самастойна пакінуць небяспечную зону не мог з прычыны моцнага ап'янення. Работнікі МНС вывелі яго на вуліцу і перадалі медыкам. Пацярпелага шпіталізавалі з папярэднім дыягназам: атручэнне прадуктамі гарэння. Меркаваная прычына пажару — неасцярожнае абыходжанне з цыгарэтай падчас курэння.

Ратавальнікі нагадваюць: ваша жыццё ў вашых руках. Беражыце сябе і сваіх блізкіх!

Марына ВАСІЛЕЎСКАЯ, галоўны спецыяліст Рэспубліканскага цэнтра прапаганды МНС.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Мирополье» (продавец) проводит повторный открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ АДМИНИСТРАТИВНО-ХОЗЯЙСТВЕННОГО

(составные части и принадлежности: цокольный этаж, крыльцо)

с инв. № 610/С-57979 общей площадью 439 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 620887403601000302 (право аренды по 02.02.2113) площадью 0,4633 га по адресу: Минская область, Борисовский район, Пригородный с/с, д. Житьково, ул. Новая, 15А.

Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав: *охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0213 га; охранная зона линий электропередачи напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,0249 га; водоохранная зона водных объектов, пл. 0,4186 га; прибрежная полоса водных объектов, пл. 0,0447 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) – **61 088,72 бел. руб.**

Задаток 10 % от начальной цены – **6 108,87** бел. руб.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере: 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 16.04.2020, 05.06.2020, 18.08.2020, 26.09.2020.

Аукцион состоится **06.09.2021** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **03.09.2021** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.
Тел. для осмотра: (8044) 555-25-91.

УНН 600134365

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона, оператор ЭТП	**ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: www.torgi24.by**
Продавец	**ОАО «Столбцовский РКБО» Минская область, г. Столбцы, ул. Я Коласа, 28**

Предмет электронных торгов:

Лот	Наименование (назначение), инвентарный номер	Начальная цена с НДС (бел. руб.)
801	Капитальное строение, 622/С-46405	34 920
802	Капитальное строение, 622/С-46404	30 360
803	Капитальное строение, 662/С-46902	19 200
804	Капитальное строение, 662/С-46903	15 840
805	Капитальное строение, 622/С-47363	15 720

расположенные по адресу: Минская обл., Столбцовский р-н

Размер шага составляет **5 %** от начальной цены лота

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (**для каждого лота**) перечисляется на р/с: BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней после электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **10 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту (для каждого лота) – не более **650,00 бел. руб.**

Дата и время начала торгов: 20.09.2021 в 11.00 г. Минск, ул. Антоновская, 2, каб. 17

Для участия в торгах необходимо подать заявку и пройти регистрация в качестве участника торгов на торговой площадке: **www.torgi24.by**. Прием документов на участие в торгах осуществляется организатором торгов ООО «Расантехторг» на электронную почту: **info@torgi24.by**. Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – с 19.08.2021 по 17.09.2021 с 9.00 до 17.00

Контактные данные: +375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87. E-mail: info@torgi24.by.

СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«Лето призов в Виталюр!»

Сведения об организаторе – является Общество с ограниченной ответственностью «ЭфСиБи Бел» (далее – Организатор), УНП 193185741.

Юридический адрес: Республика Беларусь, 220037, г. Минск, пер. Козлова, д. 25, пом. 22.

Территория проведения рекламной игры: все магазины «Виталюр» на территории Республики Беларусь.

Срок начала рекламной игры: 02.06.2021.

Срок окончания рекламной игры: 31.08.2021.

Сведения о государственной регистрации рекламной игры: свидетельство о государственной регистрации рекламной игры № 3995 от 19.05.2021, выданное Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

Сведения о количестве участников рекламной игры: 136 257 участников.

Призовой фонд разыгран полностью.

Победители:
полная информация о победителях Рекламной игры и их выигрышах опубликована по ссылке
https://vitalur.by/leto

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры: +375 (29) 322 42 52. Время работы горячей линии: с 09.00 до 21.00 пн.–пт. с 10.00 до 16.00 сб.

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего
ОАО «Управляющая компания холдинга «МИНСКИЙ МОТОРНЫЙ ЗАВОД» (Продавец)

Лот № 1: 1. Здание гостиницы (литер Е 2/к) с инв. № 500/С-4893, 633,4 кв. м. 2. Хозяйственно-бытовая канализационная сеть с инв. № 500/С-1027657, 34,8 кв. м. 3. Кабельная линия 0,4 кВ с инв. № 500/С-1027656, 223 кв. м. 4. Хозяйственно-питьевая водопроводная сеть с инв. № 500/С-1027655, 18,3 кв. м. 5. Ель колючая дерево, инв. № 45154/2. 6. Ель колючая дерево, инв. № 45154/3. 7. Обыкновенный газон 55 кв. м, инв. № 45154/1Г. 8. Гортензия кустарник, инв. № 45154/1К. 9. Папоротник 8 кв. м (цветник), инв. № 45154/1Ц. 10. Обыкновенный газон 67 кв. м, инв. № 45154/2Г. 11. Сосна жесткая кустарник, инв. № 45154/2К. 12. Эригерон 32 кв. м (цветник), инв. № 45154/2Ц. 13. Сирень обыкновенная кустарник, инв. № 45154/3К. 14. Летние 8 кв. м (цветник), инв. № 45154/3Ц. 15. Гортензия кустарник, инв. № 45154/4К.

Адрес: г. Минск, ул. Щербакова, 36.
Начальная цена с НДС – 533 232,92 руб.
Задаток – 53 323,29 руб. **Штраф** – 20 000,00 руб.
Земельный участок с кадастровым номером 500000000001000367 площадью 0,1024 га. Право постоянного пользования.

Аукцион состоится **09.09.2021 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. **Шаг аукциона** – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 ОАО «Белагропромбанк», г. Минск ул. Романовская Слобода, 8, BIC банка BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.

Окончание приема заявлений с прилагаемыми к ним документами – **07.09.2021 в 11.00**.

☎ Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «ОРС Гомель» (арендодатель) извещает о проведении 21 сентября 2021 года открытого аукциона по продаже права на заключение договора аренды недвижимого имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование и адрес лота	Начальная цена продажи, бел. руб., с учетом НДС 20 %	Сумма задатка, бел. руб., с учетом НДС 20 %
1	**Капитальное строение с инв. № 310/С-23734,** площадью **211,9 кв. м, с составными частями и принадлежностями (106,5; 46,7; 5,2; 10,4; 1,5; 36,9; 4,7 кв. м)** назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – **магазин № 67**. **Местонахождение:** Гомельский р-н, Приборский с/с, на станции Прибор вблизи п. Пионер (магазин № 67). Арендная плата в месяц **38,142** базовых арендных величин (с учетом НДС 20 %). Коэффициент спроса – **3,0**. Базовая ставка – **0,3**. Коэффициент местоположения – **0,6**. **Цель использования:** розничная торговля. **Срок аренды – 3 (три) года**	**895,28**	89,53
Сведения о продавце	ОАО «ОРС Гомель», г. Гомель, ул. Калинина, 14. Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.: **8 (029) 173-57-21 – Лызова Виктория Евгеньевна**		
Срок подачи заявления	**с 19.08.2021 г. по 17.09.2021 г. включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00, по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» **(предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за 3 (три) дня до его проведения		
Номер р/с для перечисления задатка	**Организатор торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, **назначение платежа** – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)		
Размер штрафа	**Лот № 1 – 10 (десять) базовых величин,** согласно Указу Президента РБ от 10.01.2013 г. № 14 «О внесении изменений и дополнений в Указ Президента РБ от 05.05.2009 г. № 232» (Об определении размера штрафа в случае отказа или уклонения участника, выигравшего торги от условий проведения аукционных торгов, согласно действующему законодательству)		

Шаг аукциона – 10 (десять) %. К участию допускаются только индивидуальные предприниматели или юридические лица. Необходимо в адрес Организатора торгов подать заявление по установленной форме, подписать соглашение с Организатором торгов и предоставить необходимые документы: копию платежного поручения о перечислении задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя; юридическим лицом нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; представителем юридического лица или индивидуального предпринимателя предъявляет оригинал доверенности (документ, подтверждающий, полномочия должностного лица). При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия. При заключении договоров аренды ставка арендной платы может быть скорректирована с учетом обязательности применения в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29.03.2012 г. № 150 понижающих или повышающих коэффициентов в зависимости от вида деятельности, осуществляемой на арендуемых площадях, и категории арендатора. В случае единственного участника торгов, ему будет предложено приобрести лот по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) процентов**. Победитель аукциона (лицо, приравненное к победителю аукциона): в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня его проведения обязан в установленном порядке перечислить на текущий (расчетный) счет Арендодателя сумму, за которую продан предмет аукциона, за вычетом внесенной им суммы задатка; в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола оплатить Организатору аукциона по результатам аукциона вознаграждение в размере **10 (десяти) % от цены продажи Объекта** (вознаграждение оплачивается в белорусских рублях по курсу Национального банка РБ на дату подписания протокола о результатах аукциона), а так же затраты на публикацию извещения в газете «Звязда» от 19.08.2021 г. С участником, ставшим победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) в течение **10 (десяти) рабочих дней** после проведения аукциона и подписания протокола будет заключен договор аренды недвижимого имущества. В срок не позднее **5 (пяти) рабочих дней** после подписания договора аренды победитель торгов обязан подписать акт приема-передачи арендуемого имущества. Аукцион проводится в соответствии Положения «О порядке проведения аукционов по продаже права заключения договоров аренды капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машиномест, их частей, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.08.2009 г. № 1049.

Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www. expert-usluga.by раздел «Аукционы» или www.gomeloblreklama.by.

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54, 8 (029) 651-22-19, 23-23-56, 8 (029) 126-66-62.

Извещение о повторном открытом аукционе по продаже конфискованного имущества 21 сентября 2021 года

№ лота	Наименование и местонахождение недвижимого имущества	Начальная цена, руб.	Сумма задатка, руб.
1	Капитальное строение с инвентарным номером 412/С-24924 (наименование – гараж). Местонахождение недвижимого имущества: Гродненская область, Мостовский район, г. Мосты, ул. Кольцевая, 5А/9, блок 7	648,00	64,00
2	Капитальное строение с инвентарным номером 412/С-1861 (наименование – жилой дом). Местонахождение недвижимого имущества: Гродненская область, Мостовский район, Дубненский с/с, д. Сухиничи, ул. Стельмаховская, д. 50	1 620,00	162,00
3	Капитальное строение с инвентарным номером 412/С-25038 (наименование – жилой дом). Местонахождение недвижимого имущества: Гродненская область, Мостовский район, Куриловичский с/с, д. Стукалы, ул. Кольцевая, д. 4	745,20	74,00
4*	Капитальное строение с инвентарным номером 400/С-86911 (наименование: гараж). Местонахождение недвижимого имущества: Гродненская область, г. Гродно, ул. Понемунская, д. 2В/1017, блок 10	5 197,50	519,00

Имущество продается по поручению управления по Гродненской области Департамента по гуманитарной деятельности Управления делами Президента Республики Беларусь.

** Возможность осмотра имущества до его приобретения отсутствует.*

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, тел.: (0152) 626055, 626056.

При проведении торгов предусмотрен шаг аукциона – 10 %. Условия продажи отсутствуют.

Уполномоченный орган и хранитель недвижимого имущества предоставляют возможность предварительно ознакомиться с недвижимым имуществом (за исключением лота № 4).

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, заключившие соглашения с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, внесшие задаток, а также представившие организатору торгов следующие документы:

- копии платежных поручений о внесении **задатка** за подачу заявления на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 в Гродненском областном управлении № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 590727594 получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», с отметкой банка-отправителя об их исполнении.

Юридическое лицо: доверенность, выданную представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), одну копию учредительных документов; **физическое лицо**: паспорт, а в случае участия в аукционе представителя физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность. Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в день и время, установленные организатором аукциона и указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. По письменному указанию подразделения Департамента недвижимое имущество может быть снято с аукциона организатором аукциона в любое время до объявления его проданным.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене продажи, увеличенной на 5 процентов.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условием на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

Оплата стоимости приобретенного имущества осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 20 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель обязан возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона в течение 3 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Аукцион состоится 21 сентября 2021 года в 12.00 в здании горисполкома по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 в рабочие дни с 8.00 – 13.00 и 14.00 – 17.00 **с 23 августа по 15 сентября 2021 года.** Телефоны для справок в Гродно: (0152) 626055, 626056

Адреса сайтов: Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь http://gki.gov.by, Гродненского городского исполнительного комитета http://www.grodno.gov.by, коммунального унитарного предприятия по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» http://gcn.by

ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «МГЦН» **14 сентября 2021 года** проводит **313-й открытый аукцион по продаже права заключения договоров аренды** капитальных строений (зданий, сооружений), изолированных помещений, машино-мест, их частей, находящихся в государственной собственности (далее – имущество)

№ предмета аукциона	Предмет аукциона (срок договора аренды, наименование, место нахождения недвижимого имущества, право заключения договора аренды которого выставляется на аукцион)	Площадь, кв. м	Начальная цена права заключения договора аренды имущества (руб.)
1	Помещения в подвале и на 1-м этаже здания, расположенные по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 24. Договор аренды заключается на 10 лет с момента ввода кафе в эксплуатацию и получения технического паспорта на кафе	349,0	1 474,53
2	Помещение на 1-м этаже двухэтажного здания железнодорожного вокзала, расположенное по адресу: Гродненская обл., Дятловский р-н, Новоельнянский с/с, г. п. Новоельня, пер. Железнодорожный, 1 (*)	10,5	44,36
3	Помещение на 1-м этаже двухэтажного здания, расположенное по адресу: Гродненская обл., Вороновский р-н, Беняконский с/с, аг. Бенякони, ул. Вокзальная, 5 (*)	16,7	70,56
4	Отдельно стоящее одноэтажное здание склада с рампой, расположенное по адресу: Гродненская обл., Гродненский р-н, Поречский с/с, аг. Поречье, ул. Гуляева, 1А (*)	296,3	1 251,87
5	Помещение в одноэтажном здании склада чистого белья, расположенное по адресу: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Фроленкова, 13/4 (*)	51,6	218,01
6	Машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 87-238 (*)	18,5	78,16
7	Машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 87-190 (*)	16,7	70,56
8	Машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 87-202 (*)	17,4	73,52
9	Машино-место, расположенное по адресу: г. Минск, ул. Притыцкого, 87-208 (*)	18,1	76,47
10	Нежилое помещение на 4-м этаже здания гостиницы, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, пр-т Революции, 4 (*)	36,9	155,90
11	Нежилое помещение на 1-м этаже жилого дома, расположенное по адресу: Минская обл., Борисовский р-н, г. Борисов, ул. Лопатина, 160-120 (*)	52,2	220,55

* Договор аренды заключается сроком на 3 года

Организатор аукциона – государственное предприятие «МГЦН», г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 10

Срок и место приема заявлений: с 13 августа 2021 г. по 10 сентября 2021 г. включительно в рабочие дни с 9.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.30 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах изложен в извещении о проведении аукциона, размещенном на интернет-сайтах: организатора аукциона – www.mgcn.by (раздел «Недвижимость в аренду»); Минского областного исполнительного комитета – www.minsk-region.gov.by; Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь – www.gki.gov.by (раздел «ПРОДАЖА/АРЕНДА ИМУЩЕСТВА»).

Телефон для справок +375 (17) 360 42 22

УНП 190398583

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Гипроживмаш» (продавец) извещает о проведении 31 августа 2021 года открытого повторного аукциона со снижением цены на 80 % по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
1	**Изолированное помещение с инв. № 350/D-187461, площадью 256,4 кв. м**, назначение – административное помещение, наименование – **административное помещение. Адрес:** г. Гомель, ул. Барыкина, д. 230-1	**44 400,00**	2 220,00

Продавец: ОАО «Гипроживмаш», г. Гомель, ул. Малайчука, 12.

Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел. 8 (0232) 53-27-08 – Лодня Татьяна Витальевна.

Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.

Для участия в аукционе необходимо:

1. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора торгов (ОАО «Гомельоблреклама»):** р/с BY52 BLBB 3012 0400 0712 0400 1001, БИК BLBBBY2X, дирекция ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400071204, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № 1 **(задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления)**.

2. Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 19 августа 2021 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 27 августа 2021 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %**. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается **Организатором торгов** в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату за услуги (вознаграждение) по организации и проведению торгов в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола, а также затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **15 (пятнадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество в срок согласно договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 16.04.2021 г. № 71 (29440). Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: (тел./факс) 8 (0232) 23-23-54, 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «Гомельский винодельческий завод»** (УНП 400051877) 246003, г. Гомель, ул. Рогачевская, 10, тел. +375 (232) 71-38-55 в лице антикризисного управляющего Костяна Дмитрия Александровича.

Публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **20 сентября 2021 г. в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28.

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС
1	Имущество филиала «Пиревичский спиртзавод» ОАО «Гомельский винодельческий завод» *с обременением**, Гомельская обл., Жлобинский р-н, аг. Пиревичи, ул. Суворова, 4 А	3 318 544,02
2	Имущество филиала «Рогачевский» ОАО «Гомельский винодельческий завод», Гомельская обл., г. Рогачев, ул. Богатырева, 36	94 800,00
3	Имущество филиала «Речицкий» ОАО «Гомельский винодельческий завод», Гомельская обл., г. Речица, ул. Винзаводская, 4	355 413,80
4	Имущество филиала «Чечерский» ОАО «Гомельский винодельческий завод», Гомельская обл., г. Чечерск, ул. Советская, 72 А	69 760,32

Подробнее с составом лотов можно ознакомится на сайте beltorgi.by. Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

Для участия в торгах необходимо в срок с 20.08.2021 г. 09.00 по 17.09.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов: не позднее 30 календарных дней со дня проведения торгов.

* Оборудование котельной, которое предлагается к продаже, обременено договором безвозмездного пользования №1 от 23.08.2019 г. с КДУП «Теплосервис». Победитель торгов обязан будет заключить договор безвозмездного пользования с КДУП «Теплосервис» на использование оборудования котельной согласно приложения № 1 к договору №1 от 23.08.2019 г. сроком до 06.01.2023 г.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Дзержинского филиала Минского областного потребительского общества (продавец) проводит открытый аукцион по продаже:

Лот № 1: здание магазина № 38 с инв. № 620/С-42794 общ. пл. 102,0 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 622282805001000087 площадью 0,0659 га по адресу: Минская область, Дзержинский район, Негорельский с/с, д. Каменка, ул. Новая, 1А.

Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, площадь 0,0088 га.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 18 360,00 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **1 836,00 бел. руб.**).

Лот № 2: здание магазина № 84 с инв. № 620/С-43046 общ. пл. 88,9 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 622283006601000020 площадью 0,1895 га по адресу: Минская область, Дзержинский район, Путчинский с/с, д. Липки, ул. Дружная, 3.

Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона ручья № 76, площадь 0,1895 га; охранная зона электрических сетей напряжением до 1000 вольт, площадь 0,0054 га.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 8 880,00 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **888,00 бел. руб.**).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в следующем размере: по лоту № 1 – 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, по лоту № 2 – 10 (десяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **20.09.2021 в 14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **17.09.2021 до 16.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Тел.: (8017) 516-80-64, 516-80-65, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11, тел. для осмотра: (801716) 649-33, (8029) 578-35-46.

УНП 600037767

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона: ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by

Продавец: ЗАО «Горизонт-Белинвест-Девелопер», г. Минск, ул. Красная, д. 7, ком. 4, 220029

Оператор ЭТП: ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46, www.ipmtorgi.by

№ лота	Наименование предмета аукциона	Начальная цена с НДС 20 %
1	**Здание магазина продовольственных товаров с помещением для хранения продуктов питания** общей площадью 664,4 кв. м, инв. номер 710/С-11693, по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Урицкого, д. 27 Составные части и принадлежности: мансарда, тамбур, два навеса Обременение: аренда. Подробнее на сайте организатора аукциона	**320 829,47 бел. руб.**
Сведения о земельном участке	Общ. пл. 0,1101 га, предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания магазина продовольственных товаров с помещением для хранения продуктов питания	
2	**Здание производственно-бытового корпуса** общей площадью 3 695 кв. м, инв. номер 710/С-2712, по адресу: Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Минская, 170	**229 163,90 бел. руб.**
Сведения о земельном участке	Общ. пл. 0,9864 га, предоставлен на праве постоянного пользования для размещения объектов неустановленного назначения	
3	**Здание гостиницы** общей площадью 1155,2 кв. м, инв. номер 710/U-3619, по адресу: Могилевская обл., Бобруйский р-н, Сычковский с/с, около д. Сычково	**126 538,33 бел. руб.**
Сведения о земельном участке	Общ. пл. 0,2796 га, предоставлен на праве аренды (по 25.04.2027) для содержания и обслуживания незавершенного законсервированного здания гостиницы	

Обременения по лотам №№ 1–3: залог в ОАО Банк Развития Республики Беларусь

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (BYN) перечисляется на р/с BY77 BLBB 3012 0191 4380 2600 1001 в ГОПЕРУ ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29, БИК BLBBBY2X. **Получатель платежа:** ЗАО «Горизонт-Белинвест-Девелопер», УНП 191438026

Срок подписания договора купли-продажи	**10 (десять)** рабочих дней после электронных торгов. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнуту договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 10.07.2021 г.

Дата и время начала и окончания электронных торгов:
Начало торгов: 10.00. 02.09.2021 г.
Окончание торгов: 12.00 02.09.2021 г.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок	**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 31.08.2021 г. до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**
Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by**

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества РУП «ИНСТИТУТ БЕЛНИИС» (Продавец)

Лот № 1: Легковой седан ФОЛЬКСВАГЕН ПАССАТ, кузов (рама) № WVWZZZ3CZ7P026675, г. в. – 2006.
Начальная цена с НДС – 5 098,00 руб.

Лот № 2: Легковой специальный вагон ФОЛЬКСВАГЕН ТРАНСПОРТЕР, кузов (рама) № WV2ZZZ7HZ6H023863, г. в. – 2005.
Начальная цена с НДС – 13 184,00 руб.

Лот № 3: Прицеп МАЗ 81144,
кузов (рама) № Y3M811440Y0000378, г. в. – 2001.
Начальная цена с НДС – 323,00 руб.

Лот № 4: Прицеп автомоб. МАЗ-8162, кузов (рама) Y3M81620010001048, инв. № 563, г. в. – 2001.
Начальная цена с НДС – 340,00 руб.

Местонахождение Лотов №№ 1–4:
г. Минск, ул. Ф. Скорины, 15 «Б».

Аукцион состоится 21.09.2021 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4. Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и Организатора аукциона ino.by.

☎ Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

Нататкі шматдзетнага таткі

НАРМАЛЬНЫЯ ЛЮДЗІ ЗАЎСЁДЫ ДАМОВЯЦЦА!

* * *

Дзеці:

— Тата, мы прыгатавалі святочны дэсерт. Хочаш паспрабаваць?

— Дзякуй, я не галодны. (Лічу за лепшае з дзіцячымі дэсертамі не эксперыментаваць.)

— Ну, паспрабуй, калі ласка, мы ж стараліся.

— Добра, давайце.

Пачаў есці: нешта такое шакаладнага колеру, але пры гэтым не шакаладнага смаку, на зуб даволі гумовае і цяжка пражавальнае. Увогуле, незразумела што, але не есці нельга.

Дзеці:

— Ну што, смачна?

— Смачна.

— А ведаеш, як называецца?

— Як?

— Каранавірус!

Як спяваў Высоцкі, «если правда оно, ну хотя бы на треть, остается одно: только лечь помереть».

P. S. *Але наогул крыўдна: цэлы месяц націскаць кнопкі ў ліфце локцямі, каб у выніку трапіць на такое глупства.*

* * *

Што мне падабаецца ў дзецях, нават у тых, што ўжо падраслі, дык гэта іх шчырасць. Гэта значыць, яны, вядома, могуць хітраваць, але гэта заўсёды адчуваецца, затое яны значна часцей за нас, дарослых, дзейнічаюць шчыра, не асцерагаючыся наступстваў.

Як свежы прыклад: мы з сынам зараз жывём дома, а жонка з чатырма дочкамі жыве за горадам. На выхадных я да іх далучаюся. А сёння мы ўсёй кампаніяй вырашылі заехаць дадому, у госці да сына, пра што жонка яго загадзя апавясціла праз вайбер: маўляў, Арсеній, мы сёння прыязджаем дадому.

І як вы думаеце, якое адзінае пытанне задаў сын у адказ? Можа, ён спытаў: «У колькі?» або «Вас сустрэць?» або «Да вашага прыезду што-небудзь прыгатаваць?» ці, можа быць, ён напісаў нешта накшталт: «Выдатна! Я так засумаваў»?

Не, нічога гэтага ён, зразумела, не спытаў. Ён напісаў у адказ усяго адно кароценькае слова, якое ўтрымлівала ў сабе велізарны сэнс: «Назусім?»

P. S. *А я на секунду ўявіў, што гэта я так адказаў жонцы на навіну пра іх прыезд, і ў мяне па спіне прабегла дрыготка.*

* * *

Будучы бацькам са стажам, я для сябе даўно вызначыў любімы ўзрост сваіх дзяцей: тры гады. Лічу, што менавіта ў тры гады маленькі чалавек дасягае свайго росквіту: па-першае, ён можа самастойна хадзіць на гаршчок. Па-другое (хоць для мяне дастаткова і па-першае), ён можа самастойна есці. Ну і, па-трэцяе, ён можа сам знаходзіць сабе заняткі і забавы.

Але падабаецца мне гэты ўзрост — а менавіта столькі зараз маёй малодшай дачцэ — нават не таму. Проста ў тры гады дзіця ўжо дастаткова добра кеміць, каб з ім можна было мець зносіны практычна на роўных, і пры гэтым яно яшчэ няхітрае і простае, каб маніпуляваць іншымі. Але да чатырох гадоў гэта пройдзе.

І паспрабуйце дакажыце, што я не маю рацыі.

* * *

Сын:

— Тата, ты што, зноў пра мяне гісторыю ў Фэйсбуку напісаў?!

— З чаго ты ўзяў?

— Сябры сказалі.

— У маім Фэйсбуку няма тваіх сяброў (цьфу-цьфу-цьфу).

— Яны мне скрын скінулі.

Паказвае свой тэлефон. Гляджу: сапраўды скрын. Праўда, не з маёй стужкі, а з агульнадаступнай групы «Вар'яцкі Капялюшнік».

Кажу яму:

— Дык гэта ж не мая стужка.

— Ну і што? Ты ж гісторыю напісаў.

Спрабую загаварыць зубы:

— А ты бачыў, колькі там лайкаў? Пяцьсот!

— Значыць, так, тата. Або ты больш не пішаш пра мяне гісторый, або купляеш у мяне патэнт.

Ну вось, гэта ўжо іншая размова! А то палохае мяне сваімі сябрамі. У мяне, можа, таксама сябры ёсць. І наогул, нармальныя людзі заўсёды змогуць дамовіцца.

* * *

Старэйшыя дзеці ўбачылі ў інтэрнэце ролік, дзе трохгадовы хлопчык даведваецца ад мамы, што яна з'ела ўсе яго цукеркі. Спачатку хлопчык вельмі знерваваўся, але потым, калі мама стала плакаць, сказаў ёй: «Не плач, мамачка, усё добра, я не крыўдую».

Увогуле, дзеці расчуліліся і вырашылі паўтарыць эксперымент са сваёй малодшай, таксама трохгадовай, сястрой. Для гэтага яны ўгаварылі маму паведаміць Ксеніі, што яна вельмі хацела есці і таму з'ела яе цукеркі.

На іх здзіўленне, Ксенія адразу заплакала і запатрабавала прад'явіць цукеркі. А калі мама сказала: «Прабач мне, Ксюша, я іх з'ела», Ксенія адказала коратка, але цвёрда: «Не дарую».

На жаль, зняць гэта на відэа дзеці не здагадаліся, а другога дубля, як вы разумееце, у дадзенай сітуацыі быць не можа. Так што прыйдзецца ім або шукаць іншае дзіця, або чакаць, калі ў нас народзіцца наступнае.

* * *

Занесла мяне днямі ў тыя мясціны, дзе знаходзіцца мая школа і дзе праз шмат гадоў наша сям'я жыла першыя тры гады пасля вяселля, дзе нарадзіліся нашы старэйшыя дзеці. А цяпер мы ішлі з малодшай дачкой па алеі ўздоўж канала, яна без канца бегала за галубамі, а я ўспамінаў...

Успамінаў, як калісьці сам бегаў тут падчас школьных перапынкаў і пасля ўрокаў (а часам і замест іх). Як у далейшым гуляў уздоўж гэтага ж самага канала з каляскай, у якой мірна спаў будучы прызёр міжнародных фізічных алімпіяд.

Колькі мне было тады? 25? А цяпер 42. І вось сёння той жа самы я (або ўжо не той?) зноў іду ўздоўж таго ж самага канала — на гэты раз са сваёй малодшай дачкой — і ўдыхаю дурманлівы водар лета.

На хвілю заплюшчыў вочы і ўявіў, што мне «зноў дваццаць пяць». Уявілася дастаткова лёгка: як быццам я не так ужо моцна змяніўся за мінулы час.

Але штосьці ўсё ж незваротна пайшло. Што? Галоўным чынам знікла тое непаўторнае пачуццё або, дакладней, прадчуванне таго, што ты яшчэ вельмі малады і наперадзе цудоўнае, бясконцае і поўнае дзіўных адкрыццяў жыццё. Вось гэта пачуццё сышло незваротна.

Ішлі мы з дачкой за ручку па алеі майго дзяцінства, па плітцы, якую не мянялі яшчэ з маіх школьных часоў. Дачка бестурботна аб чымсьці балбатала, а я думаў пра тое, што менавіта ў такія хвіліны, калі ты раптам апынаешся ў тых мясцінах, якія добра ведаў па мінулым жыцці і якія памятаюць цябе іншага, ты толькі і пачынаеш па-сапраўднаму ўсведамляць, наколькі з аднаго боку хуткацечнае, а з іншага — непаўторнае і бясцэннае гэтае зямное жыццё.

Павел ХОЛАД.

ХАТНЯЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ

ПАКАШТУЙЦЕ!

ЗАКУСКА З КАБАЧКА

Спатрэбіцца: *кабачкі маладыя — 2-3 шт., кроп, пятрушка і часнок — на смак, лімонны сок — 3-4 ст. л., соль — на смак.*

Кабачкі рэжам на дзве часткі, потым на пласціны. Тонка рэжаць не трэба, хай будуць каля 0,7 см таўшчынёй. Абсмажваем з двух бакоў.

Здрабняем зяленіва, часнок і змешваем з лімонным сокам і соллю.

У ёмістасць укладваем абсмажаныя лустачкі кабачкоў, перакладваем кожны пласт зяленівам з сокам лімона. Накрываем ёмістасць і адпраўляем у халадзільнік на гадзіну.

Закуска атрымліваецца свежая, духмяная. Калі не любіце шмат алею ў кабачках, то можна іх запячы ў духоўцы, проста спырснуўшы кожную лустачку нерафінаваным алеем — ён надае марынаванай гародніне выдатны смак.

Такім жа чынам можна прыгатаваць і баклажаны ці салодкі перац.

САЛАТА «ХВІЛІНКА»

Спатрэбіцца: *памідор сярэдніх памераў — 1 штука, белыя сухарыкі — 100 г, плаўлены сырок — 1 штука, любое зяленіва па вашым выбары — некалькі галінак, часнок — зубок, маянэз.*

Памідор нарэзаць невялікімі кавалачкамі. Сырок надзерці на буйной тарцы. Зяленіва нарэзаць дробна. Здрабніць часнок. Усё злучыць разам, дадаць сухары і перамяшаць.

Заправіць маянэзам. Упрыгожыць па жаданні.

СУПЕРШАКАЛАДНЫ БІСКВІТ

Спатрэбіцца: *мука — 1 шклянка, цукар — 1 шклянка, какава — 0,5 шклянкі, малако — 1 шклянка, яйкі — 2 шт., алей — 50 мл, разрыхляльнік — 1 пакуначак (10 г), ванілін.*

Змяшаць муку, цукар, разрыхляльнік, ванілін, какаву, уліць малако, дадаць алей.

Яйкі ўзбіць міксерам (5 хвілін) і дадаць у цеста. Добра ўзбіць.

Выпякаць пры 180 С° 30-45 хвілін. Пакрыць глазурай або шакаладам.

ХІТРАСЦІ ШЭФ-КУХАРАЎ

✓ Каб надаць лёгкі часночны водар усёй страве, натрыце зубком часнаку талерку, а тады ўжо выкладвайце на яе салату або гарнір.

✓ Саліце пячонку толькі ў канцы прыгатавання, інакш яна стане цвёрдая.

✓ Каб верх пірага не прыгараў, прыкрыйце яго змочанай паперай.

✓ Рыс атрымаецца белы, калі пры гатаванні дадаць у яго трохі воцату.

✓ Для нарэзкі яйка, звараная ўкрутую, намачыце лязо нажа халоднай вадой. Так жаўток не будзе крышыцца.

✓ Калі кіпуць у булён кавалачак лёду і давесці вадкасць да кіпення, яна будзе празрыстая.

✓ Пры варцы фасоля не пацямнее, калі рабіць гэта ў адкрытым посудзе.

✓ Фарш будзе смачнейшы, калі дадаць у яго трохі сырой цыбулі, трохі падсмажанай цыбулі ды дробна надзёртай сырой бульбы.

✓ Ялавічына не будзе цвёрдай, калі перад прыгатаваннем прамарынаваць яе ў маянэзе на працягу 30 хвілін.

✓ Баклажан не будзе непрыемна гарчыць, калі перад прыгатаваннем нарэзаць яго на невялікія кавалачкі, пасаліць і даць крыху пастаяць. Не забудзьцеся пасля гэтага прамыць баклажаны ў халоднай вадзе.

ВАРТА ВЕДАЦЬ

СОДА СЭКАНОМІЦЬ КУЧУ ГРОШАЙ!

Сродак, які каштуе капейкі, але пры гэтым ім можна мыць галаву (лепш, чым дарагімі шампунямі), посуд, даваць у ежу, мыць рэчы і лячыць цэлы шэраг хвароб.

МЯККІЯ БАБЫ

Каб фасоля, гарох, сачавіца і любыя іншыя бабовыя сталі мяккія і разварыстыя, пастаўце іх папярэдне замочваць у вадзе з каліўцам харчовай соды.

СРОДАК ДЛЯ ПАСУДАМЫЕЧНАЙ МАШЫНЫ

У пасудамыечнай машыне часта «заводзіцца» непрыемны пах. Пазбавіцца ад яго проста — проста ў кантэйнер машыны засыпце кубак соды і запусціце яе ў звычайным цыкле. Калі з першага разу пах прыбраць не атрымалася, кладзіце па чайнай лыжцы кожны раз, калі мыеце посуд.

ДНО, ЯКОЕ ПРЫГАРЭЛА

Адскрабаць прыгарэлую ежу з дна рондаля або патэльні неверагодна цяжка. Паспрабуйце адскрэбці столькі рэшткаў, колькі зможаце, а потым насыпце 0,5 шклянкі соды, заліце вадой і пракіпяціце. Пры неабходнасці паўтарыце працэдуру двойчы.

САЛОДКІЯ ПАМІДОРЫ

Калі пасыпаць зямлю вакол памідорных кустоў содай — яны вырастуць нашмат саладзейшыя.

ЧЫСТАЯ МІКРАХВАЛЕЎКА

Пастаўце ў мікрахвалеўку шклянку вады з 1 сталовай лыжкай соды і ўключыце на максімальны рэжым на 3-5 хвілін. Пасля гэтага любы бруд са сценак можна будзе проста змыць мяккай анучкай.

НЯМА ТОЙ КРАМКІ, ДЗЕ ПРАДАВАЛІСЯ Б МАМКІ (Беларуская народная прымаўка).

Каб помнілі

Праект рэалізоўваецца ў рамках Года народнага адзінства

ГІСТОРЫЯ З ПАСАЖЫРАМІ

У зале чакання вакзала станцыі Брэст-Цэнтральны працуе інтэрактыўная выстаўка «Гістарычны багаж»

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Што звычайна робяць пасажыры ў зале чакання на вакзале? Яшчэ гадоў пятнаццаць-дваццаць таму сярод варыянтаў адказу ў ліку першых было б слова «сумуюць». Бо і сапраўды, калі трэба некалькі гадзін чакаць свайго цягніка, то час ідзе асабліва марудна. А вось цяпер адказы на пастаўленае пытанне выглядаюць амаль аднолькава: «Сядзяць у смартфонах». Ды ўсё роўна, калі чакаеш доўга, і гэты занятак можа надакучыць. Але на брэсцкім вакзале з'явілася магчымасць правесці час у зале чакання з карысцю, даведацца шмат новага пра гісторыю Брэста, будаўніцтва Брэсцкай крэпасці і яе гераічную абарону, а таксама пра абарону вакзала, пра знакавых гістарычных асоб.

ЧАМАДАН ІНФАРМАЦЫІ

Інтэрактыўная выстаўка зроблена ў выглядзе адкрытага чамадана, які ўтвараюць стэнды, адсюль і назва — «Гістарычны багаж». Цэнтральнае месца экспазіцыі займае інтэрактыўны дысплэй. Тут жа можна пачуць відэааповед гісторыка, краязнаўца, супрацоўніка музея пра тую ці іншую падзею, убачыць слайд-шоу з элементамі інфаграфікі, якое ў асноўным складаецца з фотаздымкаў, у тым ліку архіўных. Па ўласным жаданні можна выбраць той ці іншы раздзел і атрымаць даведку пра славутасці, музеі, помнікі, выдатных асоб.

Скажам, на экране з'явіўся партрэт. Націскаеш на подпіс і чытаеш пра Дзмітрыя Карбышава, генерал-лейтэнанта інжынерных войскаў, Героя Савецкага Саюза, які ў свой час будаваў фарты Брэсцкай крэпасці, які пасля няўдалых спроб нямецкага камандавання прымусіць супрацоўнічаць быў зверскі закатаваны ў нямецкім палоне. У цэнтры Брэста ёсць вуліца Карбышава. А вось пра асобу найбуйнейшага савецкага вучонага — ваеннага інжынера ведаюць далёка не ўсе цяперашнія школьнікі, старэйшыя юнакі і дзяўчаты. А тут, на вакзале, можна даведацца пра славутых людзей або асвяжыць, папоўніць свае веды.

Валерый ГЕРАСІМАЎ.

Начальнік сектара ідэалогіі і сацыяльна-культурнай работы Брэсцкага аддзялення беларускай чыгункі Валерый ГЕРАСІМАЎ гаворыць, што ініцыятыва такой выстаўкі належыць расійскаму фонду «Нацыянальная культурная спадчына»:

— Канцэпцыю распрацавалі сумесна навукоўцы Расійскай акадэміі навук і нашай Нацыянальнай акадэміі навук пры садзейнічанні Беларускай чыгункі. Так з'явіўся гістарычна-асветніцкі праект «Гістарычны багаж», мэта якога — даступна і цікава расказаць наведвальнікам пра гісторыю гарадоў і рэгіёнаў, акцэнтуючы ўвагу на асобных сюжэтах і фактах. Вядома ж, галоўнай задачай праекта бачыцца выхаванне ў падрастаючага пакалення патрыятызму, любові да Радзімы. Такія інфармацыйныя пляцоўкі неўзабаве з'явяцца на вакзалах сталіцы і іншых гарадоў.

Дадзеная экспазіцыя, працягвае Валерый Уладзіміравіч, прысвечана гісторыі Брэста і Брэсцкай крэпасці, подзвігу іх абаронцаў. Значная частка матэрыялу прысвечана абароне Брэсцкага вакзала.

ПОДЗВІГ АБАРОНЦАЎ ВАКЗАЛА

І сапраўды, калі гутарка заходзіць пра першы дзень вайны, амаль любы чалавек скажа хоць колькі слоў пра абарону Брэсцкай крэпасці. Але мала каму вядома, што літаральна за некалькі кіламетраў ад легендарнай цытадэлі ў тыя дні разгортваліся не менш трагічныя падзеі, і людзі праяўлялі такія ж мужнасць і гераізм.

Важна адзначыць, што пры ўзвядзенні вакзала і станцыі Брэст-Цэнтральны ў 80-х гадах XIX стагоддзя знарок пабудавалі сетку падземных лабірынтаў на выпадак вайны: каб захоўваць запасы харчавання і хавацца на час абстрэлаў. Гэты фактар стаў вырашальным пры абароне 1941-га года. У апошнюю мірную ноч на службе ў раёне вакзала знаходзілася каля 30 супрацоўнікаў лінейнага аддзялення міліцыі. Яны і сустрэлі ворага разам з работнікамі чыгункі, асобнымі вайскоўцамі. Бой за вакзал працягваўся чатыры гадзіны. Сілы былі няроўныя, захопнікі занялі вакзал. Абарону падзямнага сховішча ўзначаліў начальнік лінейнага аддзялення міліцыі Андрэй Вараб'ёў. Немцы шмат разоў закідалі іх складзі зброю. Абаронцы адказвалі агнём. Толькі за адну ноч вораг страціў 11 чалавек. Фашысты заліваліся падвальныя памяшканні бензінам і падпальвалі, закідвалі гранатамі, запаўнялі падвалы вадой. Калі ўзровень вады дасягнуў крытычнай адзнакі, абаронцы пайшлі на прарыў. Жменьцы байцоў удалося прабіцца з пекла на волю. Андрэй Вараб'ёў загінуў пасля таго, як выбраўся з падвалаў. Пад яго кіраўніцтвам некалькі дзясяткаў байцоў у нечалавечых умовах пратрымалася дзевяць дзён.

Начальнік вакзала станцыі Брэст-Цэнтральны Віктар КУЛАЙ адзначыў, што праект рэалізоўваецца ў рамках Года народнага адзінства: «І тое, што да экспазіцыі праяўляюць цікавасць пасажыры, найчасцей каля экранаў-стэндаў спыняецца моладзь, гаворыць, што праект патрэбны і своечасовы».

Святлана ЯСКЕВІЧ.

КАЛІ ЛЕКІ СТАНОВЯЦЦА НЕБЯСПЕЧНЫЯ

ГАЛОЎНАЕ — ПАЧАЦЬ

У адкрытых крыніцах можна знайсці нямала інфармацыі пра вынікі даследаванняў вадаёмаў, глебы, гарадскіх сетак каналізацыі. Там пастаянна выяўляюць рэшткі фармацэўтычных прэпаратаў, нярэдка вельмі небяспечных, якія маюць уласцівасць назапашвацца ў жывых арганізмах. У гэтых рэштках, напрыклад, поўна антыбіётыкаў. Туды яны трапілі з нашых аптэчак. Небяспечныя рэчывы трапляюць у ваду і глебу, спажываюцца потым жывёламі, птушкамі, раслінамі, а мы з вамі вымушаныя гэта з'ядаць з усімі наступствамі для здароўя.

Праблема даўно занепакоіла баранавіцкіх грамадскіх актывістаў. Адзін з іх — Яўген Калач — і стаў ініцыятарам кампаніі «Прырода без фармацэўтычных адходаў», якая стартавала ўвосень 2019 года. Яе ідэя — у арганізацыі збору пратэрмінаваных і непрыдатных для выкарыстання лякарстваў ад жыхароў горада і раёна ў спецыяльныя кантэйнеры, а таксама ўтылізацыя сабраных фармацэўтычных прэпаратаў. Другая задача, асветніцкая, заключалася ў шырокім інфармаванні насельніцтва па ўказанай тэме. Тады ж, у лістападзе, у Баранавіцкай цэнтральнай паліклініцы быў устаноўлены першы кантэйнер для збору непатрэбных лекаў. За ім паявіліся яшчэ тры. Пазней была зарэгістравана некамерцыйная сацыяльна-экалагічная ўстанова «Цэнтр экалагічнага і сацыяльнага развіцця», які ўзначаліла жонка Яўгена — Вікторыя.

— Мы сталі працаваць не толькі ў Баранавічах, але і ў многіх іншых гарадах краіны, — расказвае Вікторыя Калач. — Самымі складанымі і працаёмкімі аказаліся арганізацыйныя пытанні. Першыя нас, дарэчы, падтрымалі камерцыйныя аптэкі, і першыя кантэйнеры з'явіліся там. Але ў далейшым мы вырашылі рабіць стаўку на паліклінікі. І вось чаму. У аптэку чалавек заходзіць нярэдка па дарозе ў краму, забягае ў абедзенны перапынак, — адным словам, вельмі часта аптэку наведваюць амаль што выпадкова. А ў паліклініку чалавек ідзе, як правіла, з дому і мэтанакіравана. Таму ён можа прыхапіць з сабой прапэрмінаваныя лекі. Гэта зручна.

Словам, пачыналі з таго, што пісалі пісьмы кіраўнікам выканаўчай улады з просьбай размясціць кантэйнеры ва ўстановах аховы здароўя, працягвае суразмоўніца. Потым спісваліся з галоўнымі ўрачамі паліклінік, узгадняліся арганізацыйныя моманты. Гэта нярэдка займала шмат часу, але ж намаганні таго вартыя.

ПЕРШЫЯ ЦЭНТНЕРЫ — ВА ЎТЫЛЬ

За год арганізацыя ўстанавіла 34 пункты збору пратэрмінаваных лекаў, у тым ліку 10 — у Брэсцкай вобласці, 13 — у Мінскай, 3 — у Гродзенскай. За гэты час сабрана і ўтылізавана больш за 325 кілаграмаў пратэрмінаваных лекаў. Дарэчы, з гарадоў больш за ўсё сабрана ў Барысаве — звыш 80 кілаграмаў. Названыя лекі спалілі ў Мінску на спецыялізаваным прадпрыемстве. Там прэпараты ўтылізуюцца шляхам спальвання пры тэмпературы не менш за 850 градусаў.

Гэта значыць, больш за 300 кілаграмаў небяспечных рэчываў не трапяць у сцёкавыя воды, у зямлю, не будуць забруджваць навакольнае асяроддзе. Але ж гэта ўсё роўна невялікая частка фармпрэпаратаў, якія проста выкідваюцца ў кантэйнеры з бытавымі адходамі і вывозяцца на палігоны.

Таму сваю другую задачу каманда «Цэнтра» бачыць у асветніцкай рабоце. Наладжана супрацоўніцтва з Беларускім дзяржаўным медыцынскім універсітэтам. Для навуковых даследаванняў адной з лабараторый ВНУ быў выкарыстаны прыкладна цэнтнер сабраных прэпаратаў.

ВА ЎСЕ ДЗВЕРЫ

Вікторыя Калач сказала, што работу ў паліклініцы па ўстаноўцы кантэйнераў яны пачынаюць звычайна гутаркай з медперсаналам. Урачоў, участковых медсясцёр просяць нагадваць пацыентам аб неабходнасці экалагічнага збору лекаў для іх далейшай утылізацыі. Часам чалавек, асабліва пажылы, і не зверне ўвагу на кантэйнер з подпісам «Пункт збору пратэрмінаваных лекаў», а вось параду свайго доктара ён успрымае як інструкцыю да дзеяння.

Яшчэ супрацоўнікі цэнтра ідуць у калектывы, найбольш у школьныя, і выступаюць там, расказваюць пра шкоду прыродзе ад лекавых прэпаратаў і неабходнасць цывілізаванага іх збору. Установа выпусціла чатыры коміксы тыражом па 250 экзэмпляраў і раздала іх. На Youtube-канале запусцілі дакументальны фільм «Прырода без фармацэўтычных адходаў». Свой праект сёлета прадставілі на рэспубліканскім экалагічным форуме. І там ён атрымаў станоўчыя водгукі.

— Мы стукаемся ў любыя дзверы, — разважае Вікторыя, — і даволі часта нам адчыняюць. Мы разумеем, што знаходзімся ў самым пачатку шляху па фарміраванні культуры спажывання лякарстваў, але ж усе гэтыя крокі трэба зрабіць, пажадана ўсім разам. Таму важна аб'яднаць намаганні ўстаноў адукацыі, аховы здароўя, жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

НА ДЗЯРЖАЎНЫМ УЗРОЎНІ

Дарэчы, гэтая работа — не асобная кампанія грамадскай арганізацыі. 20 чэрвеня 2020 года ў краіне быў зацверджаны і ўведзены ў дзеянне Тэхнічны кодэкс №13/4-Т (Правілы абыходжання з камунальнымі адходамі). Пункт 12.7 названага дакумента выглядае так: «Адходы пратэрмінаваных лякарстваў падлягаюць збору ў аптэках, бальніцах, паліклініках, амбулаторыях і іншых арганізацыях, якія аказваюць медыцынскія паслугі насельніцтву, шляхам устаноўкі спецыяльных кантэйнераў для самастойнага размяшчэння там адходаў фізічнымі асобамі або шляхам перадачы адходаў упаўнаважанаму работніку такіх арганізацый». Такім чынам, на дзяржаўным узроўні вызначана, што рэшткі лекаў не павінны трапляць у навакольнае асяроддзе.

Усё больш нашых грамадзян гэта разумее, падтрымлівае. Але неабходна, каб свядомых людзей было яшчэ больш, каб кожны расказваў пра кантэйнеры ў паліклініках суседу, таварышу па вучобе і рабоце. Гэта наша агульная справа, наша навакольнае асяроддзе і адпаведна — здароўе.

Напрыклад, у Баранавічах пункты збору заходзяцца ў цэнтральнай гарадской паліклініцы, у ветклініцы «Айбаліт», у медыцынскім цэнтры «Леда Мед», у інтэрнаце будтрэста № 25. У Брэсце лекі можна пакінуць у паліклініцы № 1, у жаночай кансультацыі па вуліцы Кірава, у філіялах паліклінік па мікрараёнах і іншых установах. Не так даўно пункт збору з'явіўся ў Маладзечне. Знайсці адрас найбліжэйшага пункта ў вашым горадзе можна ў сацыяльных сетках, альбо зайшоўшы на сайт «Цэнтра экалагічнага і сацыяльнага развіцця».

Там жа размешчаны парады па правільнай утылізацыі лекаў. Маецца на ўвазе, што выкідваць трэба таблеткі, капсулы, аэразолі, суспензіі, мазі, свечкі, папярэдне выняўшы іх з упакоўкі. Нельга выкідваць раслінныя прэпараты, вітаміны. Апошнія не прычыняюць урону навакольнаму асяроддзю, а іх утылізацыя каштуе немалых грошай. Важна спаліць вельмі небяспечныя прэпараты, якія могуць нашкодзіць здароўю. Напрыклад, рэшткі асобных лекавых прэпаратаў здольныя выклікаць праблемы рэпрадуктыўнага характару, прывесці да ўстойлівасці да антыбіётыкаў, развіцця алергіі і іншых негатыўных наступстваў. Таму трэба ўсім нам прывучацца да правільнай утылізацыі лекавых сродкаў. Не варта набываць іх у запас. Акалі нешта не выкарысталі, трэба прынесці і пакласці ў кантэйнер.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Извещение о проведении 31 августа 2021 года повторных аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС»

Сведения о продаваемом имуществе

№ предмета торгов	Наименование, характеристики и местонахождение продаваемого имущества	Сведения о земельном участке	Начальная цена, бел. руб., с учетом НДС	Размер задатка, бел. руб.
1	Капитальное строение с инв. номером 240/С-28899 общей площадью 2 162,8 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Мира, 71А, наименование – здание магазина № 43, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – подвал; капитальное строение с инв. номером 240/С-29803 протяженностью 165 м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Мира, 71, наименование – электрические сети, назначение – сооружение специализированное энергетики электрические сети к магазину № 43, составные части и принадлежности – электрические сети (участок кабеля подземного 0,4 кВВ от ТП-284 до ввода в магазин, участок кабеля подземного 0,4 кВ от ввода в здание магазина до щитовой магазина, участок кабеля подземного 0,4 кВ от щитовой жилого дома до ввода в здание магазина, участок кабеля подземного 0,4 кВ от ввода в здание магазина до щитовой магазина)	Площадь – 0,1949 га, кадастровый номер – 242400000001004376	36 576,80	3 600,0
2	Изолированное помещение** с инв. номером по бухгалтерскому учету 088554 общей площадью 169,2 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Станционная, 1-17, наименование – торговое помещение, назначение – торговое помещение	–	18 504,0	1 800,0
3	Капитальное строение с инв. номером 240/С-45976 общей площадью 115,9 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Межевский с/с, аг. Заполье, ул. Станционная, 2, наименование – здание магазина № 61, назначение – здание специализированное розничной торговли, составные части и принадлежности – электрические сети; капитальное строение* с инв. номером по бухгалтерскому учету 084792 общей площадью 22,0 кв. м, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, Межевский с/с, аг. Заполье, ул. Станционная, 2/1, наименование – здание склада	Площадь – 0,0370 га, кадастровый номер – 223684400000100005	1 826,89	180,0
4	Капитальное строение с инв. номером 240/С-44733, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г.Орша, ул. Щетинковская, 39А, общей площадью 1422,1 кв. м; наименование – здание склада с теневым навесом; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; составные части и принадлежности – теневой навес, площадка	Площадь – 0,4652 га, кадастровый номер – 223650100001016130	54 769,20	5 400,0
5	Капитальное строение с инв. номером 240/С-44721, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Щетинковская, 39Б, общей площадью 494,6 кв. м; наименование – здание склада (картофелехранилище); назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; составные части и принадлежности – пристройка, забор, площадка	Площадь – 0,2102 га, кадастровый номер – 223650100001016129	21 228,0	2 100,0
6	Капитальное строение с инв. номером 240/С-45933, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Щетинковская, 39В, общей площадью 64,4 кв. м; наименование – здание склада (фруктохранилище), назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; капитальное строение* с инв. номером 240/С-44724, расположенное по адресу: Витебская обл., Оршанский р-н, г. Орша, ул. Щетинковская, 39В/1, общей площадью 313,1 кв. м; наименование – здание тарного склада; назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; составные части и принадлежности – ограждение, площадка	Площадь – 0,1043 га, кадастровый номер – 223650100001016128	22 818,0	2 200,0

Недвижимое имущество выставлено на торги по фактическому состоянию, рекомендуется осмотр

** Ограничения (обременения): аренда до 06.10.2021 г.*

*** Согласно подпункту 9.1 пункта 9 Указа Президента Республики Беларусь от 31.12.2018 № 506 «О развитии Оршанского района Витебской области», отчуждение расположенных на территории Оршанского района объектов недвижимого имущества, находящихся в государственной собственности и собственности юридических лиц, более 50 процентов акций (долей в уставных фондах) которых находится в государственной собственности, либо входящих в состав холдингов с участием государства, может осуществляться без наличия технических паспортов, а также документов, удостоверяющих государственную регистрацию прав на данное имущество*

Условия торгов: победитель торгов (покупатель) в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 2 (двух) процентов от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов

Продавец имущества: ОАО «ДОРОРС», ул. Брестская, 77/1-2, 220099, г. Минск.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «ДОРОРС», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка, документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица, а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, получатель 31.08.2021 по предмету торгов № _ _.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Торги проводятся **31 августа 2021 года в 15.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 19.08.2021 по 27.08.2021** включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.30) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу ознакомления с продаваемым имуществом следует обращаться по телефону (017) 240-62-06.

Телефоны для справок: (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (017) 240-62-06 (ОАО «ДОРОРС»). Дополнительная информация размещена на сайте www.mgcn.by в разделе «Недвижимость в собственность».

УНП 190398583

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY**.

Продавец: **ОАО «АП г. Барановичи»** (УНП 290237319) 225417, г. Барановичи, ул. Тельмана, 102-2, тел. +375 (163) 68-18-91.

Публичные торги в электронной форме будут проведены **20 сентября 2021 г. 09.00–17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

№ п/п	Предмет торгов	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС
1	Автобус вагон Mercedes-BenzSprinterClassic 311 CDI-SBA, 2018 г. в., с инв. № 10510, гос. номер АМ6299-1	63 390,92
2	Автобус вагон Mercedes-BenzSprinterClassic 311 CDI-SBA, 2018 г. в., с инв. № 10570, гос. номер АМ6296-1	63 390,93
3	Автобус вагон Mercedes-BenzSprinterClassic 311 CDI-SBA 2018 г. в., с инв. № 10540, гос. номер АМ6295-1	64 090,93
4	Автобус вагон Mercedes-BenzSprinterClassic 411 CDI 2017 г. в., с инв. № 10600, гос. номер АМ4045-1	58 357,65
5	Автобус вагон Mercedes-BenzSprinterClassic 411 CDI 2017 г. в., с инв. № 10610, гос. номер АМ4043-1	58 357,67
6	Автобус вагон Mercedes-BenzSprinterClassic 411 CDI 2017 г. в., с инв. № 10670, гос. номер АМ4103-1	54 963,72
7	Автобус вагон Mercedes-BenzSprinterClassic 411 CDI 2017 г. в., с инв. № 10650, гос. номер АМ4101-1	54 963,73

Местонахождение предметов торгов – г. Барановичи, ул. Тельмана, 102-2.

Тел. для ознакомления и осмотра +37529 698-53-53.

Для участия в торгах необходимо в срок с 20.08.2021 г. 09.00 по 17.09.2021 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов: не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Утерянный филиалом Белгосстраха по г. Минску бланк страхового свидетельства по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии МА 0087996 **считать недействительным.**

УНП 100122726

Извещение об открытом аукционе по продаже не завершенного строительством жилого дома и земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в г. Гродно 21 сентября 2021 года

№ лота	Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер	Площадь земельного участка (га)	Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения	Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб.	Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; земельного участка), руб.	Сумма задатка, руб.
1*	Гродненская область, г. Гродно, ул. Полянная, 59 (У-413, микрорайон «Барановичи 5,6»), 440100000001006652	0,0961	Не завершенное незаконсервированное капитальное строение, степень готовности 7 %. Фундамент: железобетон; наружная площадь (площадь застройки): 117 (117) кв. м	346,80	27 723,70 (9 089,91; 18 633,79)	5 500

* – Земельный участок предоставляется в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке отсутствуют. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр. и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме)

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости».

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за земельный участок; возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; продолжить строительство жилого дома. Победитель аукциона обязан возместить затраты в соответствии с решением Гродненского горисполкома от 30.05.2019 г. № 371 «О возмещении затрат на строительство объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры».

Аукцион состоится 21 сентября 2021 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал).

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток в указанном размере, перечисляемый на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление № 400 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, УНП 590727594 получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению.

Представить в коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы;

заявление на участие в аукционе установленной формы; документ, подтверждающий внесение суммы задатка; подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

дополнительно представляются: гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина – нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом негосударственного юридического лица РБ – доверенность, выданная юр. лицом, документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица. При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан – документ, удостоверяющий личность.

Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 23 августа по 15 сентября 2021 года включительно в рабочие дни с 08.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за земельный участок; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись); выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона.

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Гродненский горисполком выдает победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона выписку из решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома, один экземпляр протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли.

При невыполнении требований об обращении за государственной регистрацией прав на земельный участок в двухмесячный срок после утверждения протокола о результатах аукциона либо признании аукциона продажи несостоявшимся, решение Гродненского горисполкома о предоставлении земельного участка утрачивает силу.

Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

Контактные телефоны: +375 (152) 626055, 626056. Адреса сайтов: Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь http://gki.gov.by/ru/auction-auinf_object/, Гродненского областного исполнительного комитета http://region.grodno.by, Гродненского городского исполнительного комитета http://www.grodno.gov.by, коммунального унитарного предприятия по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» http://gcn.by

Год народнага адзінства

ПАДАРУНАК І НАПАМІН

У Выдавецкім доме «Звязда» ў пачатку верасня выходзіць філакартычны альбом «17 верасня. Дзень народнага адзінства» вядомага ў Беларусі і за яе межамі калекцыянера старых паштовак, лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», лаўрэата Прэміі Беларускага саюза журналістаў «Залатое пяро», сталага аўтара газеты «СБ. Беларусь сегодня», члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА.

Кніжнае выданне здзяйсняецца ў рамках творчага праекта «У пошуках страчанага» (адлік гэтай унікальнай ініцыятывы, якую і сёння працягвае рэалізоўваць на сваіх старонках газета «СБ. Беларусь сегодня», — з пачатку 2000-х), у якім за многія гады ўбачыла свет каля трох дзясяткаў філакартычных альбомаў. Прэзентацыя выдання адбудзецца ў межах выстаўкі старых паштовак, іншых артэфактаў на тэму ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР, якая пройдзе ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь у святочны вераснёўскі дзень.

— Многія гады, вандруючы па розных паселішчах краіны, уважліва аглядаючы гістарычны, краязнаўчы ландшафты розных рэгіёнаў краіны, — дзеліцца разважаннямі Уладзімір Аляксеевіч, — я не магу не звяртаць увагу на тое, якая шматканфесіянальная і шматнацыянальная наша краіна, як у ёй спалучаюцца і ў фарміраванні народных культур, і ў звычайным быце розныя адметнасці — і саміх беларусаў, і прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў. І рады, што на такім высокім узроўні дзяржаўнага свята выяўлена жаданне адзінства, кансалідацыі памкненняў усіх нацыянальнасцяў па агульнадзяржаўным руху, агульнадзяржаўным будаўніцтве. І вось, дзякуючы зборам са сваёй калекцыі, я вырашыў з дапамогай старых паштовак, старых перыядычных выданняў (рэпрадукцыям з іх таксама знайшлося месца ў кнізе) распавесці пра адзінства народа Беларусі, зафіксаваўшы ў асобных раздзелах і тое, як на тэрыторыях, раней падпарадкаваных Польшчы, ішло грамадскае, палітычнае, нацыянальнае жыццё беларусаў, якія былі першыя крокі савецкай улады ў Заходняй Беларусі восенню 1939 года, і пасля расказаць, што, у адрозненне ад прыгнятальнікаў, у Беларусі заўжды знаходзілася месца, пашыралася прастора для жыцця людзей розных нацыянальнасцяў. Так было і ў Мінску, так было на Гомельшчыне, у Віцебску і Полацку, так было і ў Магілёве, на Магілёўшчыне...

Кавалерыйскія часці Чырвонай Арміі перапраўляюцца праз наведзены мост каля вёскі Забалоцце. Заходняя Беларусь. Верасень 1939 года.

Баец Чырвонай Арміі распавядае жыхарам Баранавіч пра жыццё ў СССР. 1939 год.

Сапраўды, магчымасць угледзецца ў твары беларусаў, татараў, рускіх, яўрэяў, палякаў, украінцаў, літоўцаў, латышоў прадастаўляюць старыя паштоўкі і іншы ілюстрацыйны матэрыял, ствараючы паўнавартасную карціну беларускага жыцця. Ужо неаднойчы ў перыядычным друку выказваліся думкі, прапановы пра тое, што з дапамогай візуальных сродкаў той багаты філакартычны масіў, сабраны Уладзімірам Ліхадзедавым, здольны ўплываць на вырашэнне выхаваўчых і ідэалагічных задач. Калекцыянер за апошнія два дзесяцігоддзі здолеў правезці па краіне многія выстаўкі паштовак, якія расказваюць пра Беларусь як пра краіну, пра адвечныя памкненні беларусаў да суверэнітэту, дзяржаўнасці. «У пошуках страчанага» — з праектаў, якія маюць «доўгатэрміновую» зацікаўленасць грамадства, і гэта нельга не ўлічваць у арганізацыі выхаваўчай работы ў школе, ВНУ краіны.

Раман СЭРВАЧ.
Ілюстрацыі з кнігі У. Ліхадзедава «17 верасня. Дзень народнага адзінства».

Пінск. На прыёме ў старшыні часовага гарадскога кіравання. 1939 год.

КУРС МАЛАДОГА БАЙЦА

Ён стартаваў для першакурснікаў універсітэта МНС

Вучэбна-лагерны збор першакурснікаў пачаўся ва Універсітэце грамадзянскай абароны МНС у Мінску і яго гомельскім філіяле. Ён будзе доўжыцца да канца жніўня.

Асноўная мэта — увядзенне ў будучую спецыяльнасць. На працягу трох тыдняў больш за 170 першакурснікаў пазнаёміцца з гісторыяй пажарна-выратавальнай справы Беларусі і ўніверсітэта МНС, вывучаць прававыя асновы дзейнасці органаў і падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях, а таксама асновы страявой падрыхтоўкі. Асаблівая ўвага будзе аддавацца заняткам па фізічнай і аварыйна-выратавальнай падрыхтоўцы.

У рамках грамадзянска-патрыятычнага выхавання першакурснікі факультэта тэхнасфернай бяспекі з Мінска наведаюць гісторыка-культурны комплекс «Лінія Сталіна» і Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а таксама іншыя значныя гісторыка-культурныя аб'екты Беларусі.

Для першакурснікаў інжынернага факультэта прадугледжана экскурсія па Гомелі, наведванне абласнога музея ваеннай славы, а таксама іншых помнікаў гісторыі Вялікай Айчыннай. Курсанты возьмуць удзел ва ўрачыстым мерапрыемстве на мемарыяльным комплексе «Партызанская крынічка», што прымеркавана да 80-годдзя ўтварэння партызанскага атрада «Бальшавік». Таксама прадугледжана наведванне басейна, цэнтра бяспекі і вяровачнага гарадка Ліцэя МНС.

Курс маладога байца завершыцца 11 верасня ў Мінску прынясеннем першакурснікамі прысягі на плошчы Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «БААЗ», Брестская обл., г. Барановичи, ул. Гагарина, 62
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б
Адрес ЭТП	www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов: транспортные средства, спецтехника бывшие в употреблении
Местонахождение: Брестская обл., г. Барановичи, ул. Гагарина, 62

№ лота	Наименование	Год выпуска	Инв. №	Начальная цена (с НДС 20 %), бел. руб.
1	Автомобиль MAZ 6303, рег. знак АК 2607-1	-	7773	8 628,00
2	Автомобиль SKODA SUPERB, рег. знак 1IPT 0562	2010	7805	12 528,00
3	Прицеп MAZ 837810, рег. знак АА 5501-1	2009	7803	9 000,00
4	Микроавтобус MAZ-182010, рег. знак 1ICT 1517	2012	7819	14 280,00
5	Автомобиль MAZ 543205-226, рег. знак 1ICT 1516	2010	7807	8 280,00
6	Автомобиль MAZ 543205-226, рег. знак 1ICT 1519	2010	7806	8 160,00

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов www.cpo.by. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены лота перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 15 рабочих дней после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить **вознаграждение 3 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов: 20.09.2021 с 11.00 до 13.00.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае, если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **16.09.2021 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные данные	Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by

Добрая навіна

Жнівеньскія чытанні стартуюць у бібліятэках Магілёва

У бібліятэках Магілёва з 20 па 30 жніўня пройдуць Жнівеньскія чытанні «Бібліятэка&Школа: ёсць вынік», паведаміла загадчыца аддзела бібліятэчнага маркетынгу ЦГБ імя К. Маркса Алена ШЭПЕЛЕВА.

«Традыцыйна напярэдадні новага навучальнага года бібліятэкі горада запрашаюць педагогаў, бацькоў, студэнтаў і навучэнцаў на Жнівеньскія чытанні. Гэта своеасаблівыя інфармацыйна-асветніцкія мерапрыемствы ў дапамогу адукацыйнага працэсу. Сёлета яны будуць праходзіць як у рэжыме анлайн, так і ў рэальным жыцці», — адзначыла Алена Шэпелева.

Адным з мерапрыемстваў стане промаакцыя, дзе педагогі, навучэнцы і студэнты будуць мець магчымасць не толькі наведаць інтэлектуальныя пляцоўкі і метадычныя гасцінныя, але і прыняць удзел у розных інтэрактыўных конкурсах і гульнях, пазнаёміцца з афішай маючых адбыцца мерапрыемстваў, атрымаць пакет карыснай інфармацыйнай прадукцыі.

Кніжны гасцінец

Усмешка, якую пранеслі скрозь дождж

Васіль Вітка. Шчыгол-флейтыст. Мінск, «Мастацкая літаратура», 2021.



«Адкажы, чаму ты, дрозд,
Гэтак здорава падрос?
— Шмат увосень еў рабіны,
Ну, а гэта ж — вітаміны».

Класіку беларускай дзіцячай літаратуры Васілю Вітку, сапраўднае прозвішча якога Крысько, заўсёды ўдавалася размаўляць з дзецьмі на цікавай ім мове. Недарэмна менавіта ён прыдумаў брэнд часопіса «Вясёлка», дзе працаваў шмат гадоў, — вясёлага персанажа Васю Вясёлкіна. Было на кім адпрацоўваць якасць твораў — у сям'і расло двое дзетак... Вітка і брат Міхася Лынькова, Рыгор Суніца, былі жанатыя на родных сёстрах, прыгажунях з яўрэйскай сям'і.

З пачаткам вайны Васіль Вітка страціў сувязь з жонкай і спаткаўся з роднымі толькі незадоўга да Перамогі. Ім цудам удалося ацалець.

Сёлета Васілю Вітку спаўняецца 110 гадоў, і ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» выдалі ягоны зборнік у серыі «Жывая класіка дзецям». Яркія ілюстрацыі Надзеі Барай дапамогуць маленькаму чытачу ўявіць герояў і даць волю ўласнай фантазіі... А пасля з новым імпэтам пачаць даследаваць прыроду роднай Беларусі, услухоўвацца ў галасы птаства... Бо менавіта птушкі — героі гэтага зборніка: амялушка, гарыхвостка, жаўна, круцігалоўка, крыжадзюб... Не ўсе дарослыя пазнаюць іх, убачыўшы ўжывую, а вершы Васіля Віткі дапамогуць дапоўніць імёны крылатых стварэнняў яркімі вобразамі. Кампактнае, бюджэтнае, але пры гэтым якаснае выданне.

Данііл Хармс. «Аб з'явах і існаваннях». «Азбука», Масква, 2020.



Памятаеце знакамітае выказванне барона Мюнхаўзена: «Я зразумеў, у чым ваша бяда. Вы занадта сур'ёзныя. Сур'ёзны твар — гэта яшчэ не прыкмета розуму».

Данііл Хармс, у сапраўднасці Ювачой, увесь час даказваў грамадству гэтую ісціну...

«Жила-была четвероногая ворона. Собственно говоря, у нее было пять ног, но об этом говорить не стоит».

Гэта што? Занадта мудрае альбо занадта дурное?

Калі замест усмешкі падобнае выклікае ў вас жаданне грэбліва падціснуць вусны, лепш ніколі не бярыцеся чытаць Хармса.

Ён, выхаваны ў пабожнай сямі, паслядоўна цвеліў грамадства цынічнымі выказваннямі і эпатажнымі ўчынкамі. Увесь час дэкларуючы сваю нелюбоў да дзяцей, праславіўся цудоўнымі дзіцячымі вершамі, а калі чытаў юным слухачам, яшчэ і паказваў ім фокусы, і дзеці бегалі за ім, як за чараўніком...

У зборнік, пра які мы гаворым, увайшла проза Данііла Хармса. Абсурдысцкая, хуліганская, горка-іранічная, добрыя лекі ад пафасу і шаблонаў... Самавіты чалавек ніколі ж не напіша пра сябе:

«Я родился в камыше. Как мышь. Моя мать меня родила и положила в воду. И я поплыл».

Героі яго — маленькія людзі, абсурд жыцця якіх, калі ўдумацца, проста гіпербалізаваная нуда існавання. Сусед Мікалай Іванавіч Ступін, у якога тэорыя, што ўсё — дым... Нейкі спадар Дзярняцін, якога на вуліцы муха ўдарыла ў лоб і прайшла праз галаву наскрозь, толькі свіст у мазгах пачуўся... Аляксей Аляксеевіч Аляксееў, які захацеў быць рыцарам, убачыў, як дама спатыкнулася і разбіла каўпак ад настольнай лямпы, вырашыў прынесці сябе ў ахвяру, выскачыў з трамвая і разбіў сабе твар... А калі вымаўляў словы «сцяг», «фанфара» ці проста «эпалеты», па ягоным твары бегла сляза замілавання. І нават вялікія людзі — накшталт Пушкіна і Гогаля, у гэтым свеце здраблюцца, прапушчаныя праз прафаннае ўспрыманне, робяцца мізэрнымі мноствамі, радамі клонаў...

Чалавецтва дарэмна надзімае шчокі, сцвярджаючы, што дасягнула вяршыні прагрэсу. Калі ласка, навука ў свеце Хармса:

«Одиннадцать утверждений Даниила Ивановича Хармса...

I утверждение.

Предметы пропали.

II утверждение.

Было: Числовой ряд начинается с 2. Единица не число. Единица первое и единственное совершенство. Первое множество, первое число и первое от совершенства — это 2. (Пифагорова Единица)».

І гэтак далей, са здзеклівым пафасам.

Часцяком зацемкі Хармса, з вельмі вострымі падтэкстамі, бязлітасна «троляць» уплывовыя фігуры эпохі:

«Ольга Форш подошла к Алексею Толстому и что-то сделала.

Алексей Толстой тоже что-то сделал.

Тут Константин Федин и Валентин Стенич выскочили на двор и принялись разыскивать подходящий камень. Камня они не нашли, но нашли лопату. Этой лопатой Константин Федин съездил Ольге Форш по морде. Тогда Алексей Толстой разделся голым и, выйдя на Фонтанку, стал ржать по-лошадиному. Все говорили: «Вот ржет крупный современный писатель». И никто Алексея Толстого не тронул».

Здзек, падобны да сучаснага інтэрнэтаўскага сцёбу, ці не праўда? 1934 год, калі гэта было напісана, такіх жартаў не дараваў.

Хармс памёр у турэмнай псіхарні падчас ленінградскай блакады.

Выданні для агляду прадстаўленыя кніжнай крамай «Акадэмічная кніга», Мінск, пр. Незалежнасці, 72.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.55	20.30	14.35
Віцебск —	5.41	20.23	14.42
Магілёў —	5.45	20.20	14.35
Гомель —	5.45	20.13	14.28
Гродна —	6.11	20.44	14.33
Брэст —	6.15	20.41	14.26

Месяц

Першая квадра
15 жніўня.
Месяц у сузор'і
Казярога.

Імяніны

Пр. ПРААБРАЖЭННЕ ГАСПОДНЯЕ. ЯБЛЫЧНЫ СПАС. *Андрэя, Мікалая.* ***К.*** *Канстанцыі, Андрэя, Баляслава, Юльяна, Яна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

19 ЖНІЎНЯ

У краіне

1892 год — нарадзіўся Барыс Сяргеевіч Гарбачоў (в. Забалацце, цяпер у Рагачоўскім раёне), савецкі ваенны дзеяч, герой Грамадзянскай вайны, камкор. Браў актыўны ўдзел ва ўстанаўленні савецкай улады ў Ігуменскім павеце, ваенны камісар павета. Удзельнічаў у ліквідацыі антысавецкага бунту корпуса Доўбар-Мусніцкага, у барацьбе з нямецкімі акупантамі. Камандаваў асобным кавалерыйскім палком, кавалерыйскай брыгадай у 1-й Коннай арміі. З 1926 года камандзір брыгады, дывізіі, начальнік і ваенкам Аб'яднанай ваеннай школы імя УЦВК, камандзір і ваенкам навучальных устаноў Маскоўскай ваеннай акругі. З 1937-га — камандуючы войскамі Забайкальскага, Уральскага ваенных акруг. З ліпеня 1937 года быў асуджаны Ваенай калегіяй Вярхоўнага суда СССР да смяротнага пакарання і ў той жа дзень расстраляны. 14 сакавіка 1956 года рэабілітаваны.

1910 год — нарадзіўся (г. Сянно) Алесь Жаўрук (Сінічкін Аляксандр Дзмітрыевіч), беларускі паэт. У 1938 годзе скончыў Маскоўскі інстытут гісторыі, філасофіі і літаратуры. З 1939 года ваенны карэспандэнт армейскай газеты «В бой за родину». Аўтар паэтычных зборнікаў «Ручаіны», «Дняпро выходзіць з берагоў», паэм «Крывёю сэрца», «Пра майго таварыша» і іншага. Напісаў лібрэта аперэты «Зарэчны барок». Загінуў у 1942 годзе ў баях пад Сталінградам.

1954 год — нарадзіўся Алег Анатолевіч Івашкевіч, беларускі вучоны ў галіне фізічнай хіміі і высокамалекулярных злучэнняў, акадэмік НАН Беларусі, доктар хімічных навук, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь. Аўтар больш за 400 навуковых прац у галіне фізічнай хіміі працэсаў тэрмічнага раскладання і гарэння кандэнсаваных сістэм на аснове палімерных матэрыялаў, а таксама прыкладной квантавай хіміі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

У свеце

1848 год — газета The New York Herald апублікавала першае паведамленне аб знойдзеным у Каліфорніі золаце — так пачалася «залатая ліхаманка», яскрава паказаная пазней у шматлікіх галівудскіх кінакарцінах.



1920 год — сяляне некалькіх вёсак Тамбоўскай губерні адмовіліся здаваць хлеб прадстаўнікам савецкай улады, пачатак Тамбоўскага паўстання. Часам называецца «антонаўшчынай» па прозвішчы фактычнага кіраўніка паўстання, начальніка штаба 2-й паўстанцкай арміі Аляксандра Антонава. У савецкай гістарыяграфіі — «Антонаўскі мяцеж». Як і Кранштацкае паўстанне, шмат у чым паспрыяла рашэнню аб адмове ад палітыкі «ваеннага камунізму» і пераходзе да нэпа.

1960 год — савецкі касмічны карабель «Спадарожнік-5» з сабакамі Белкай і Стрэлкай на борце зрабіў сутачны палёт і паспяхова вярнуўся на Зямлю.

Так гаварыў...

АНАТОЛЬ ВЯРЦІНСКІ:

«Ад велічы да ганьбы — адзін крок».

УСМІХНЕМСЯ

Калі ў моду ўвайшлі суперкароткія шорты і спадніцы, адразу ж стала зразумела, чаму раней жанчыны іх не насілі.

Часам вышэйшая форма поспеху — гэта абсалютная невядомасць.

Мужчына, памятай: зімой, пад вось гэтым усім, жанчына такая ж, як і ўлетку.

Мама дасылае так шмат фотак грыбоў, што я ўжо пабойваюся. Здаецца, яны ўзялі кантроль над ёй і цяпер самі фатаграфуюцца.

Разумнаму чалавеку два разы паўтараць не трэба. Разумнік цябе ўжо пасля першага разу пашле куды падалей.

Мільёны падлеткаў хочуць выратаваць нашу планету ад забруджвання.

Мільёны іх бацькоў хочуць, каб яны пачалі тое са свайго пакоя.

Пляж — гэта месца перамогі фізкультуры над маральнасцю.



ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы
тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2176.

Нумар падпісаны ў 19.30

18 жніўня 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12